Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

15 ЛЮТАГА 2007 г.
ЧАЦВЕР
№ 31 (25896)

Кошт 350 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Воінам-інтэрнацыяналістам, ветэранам вайны ў Афганістане

Паважаныя таварышы!

Штогод у Рэспубліцы Беларусь адзначаецца Дзень памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў.

У нашай краіне значнасць ратнага подзвігу салдат і афіцэраў у гарачых кропках планеты ніколі не падвяргалася сумненню. Вашы намеры былі чыстыя.

Сотні нашых суайчыннікаў не вярнуліся дамоў з Афганістана. Імёны загінулых бессмяротныя. Мы будзем памятаць аб іх, як аб героях, што засталіся вернымі Радзіме і ваеннай прысязе.

Сёння ветэраны баявых дзеянняў, воіны-інтэрнацыяналісты з'яўляюцца надзейнымі памочнікамі ў справе будаўніцтва моцнай і квітнеючай Беларусі. Вы ўносіце значны ўклад у патрыятычнае выхаванне грамадзян, падтрыманне згоды і стабільнасці ў грамадстве. Гэта дзейнасць высока цэніцца дзяржавай. Яна аказвае ўсямерную падтрымку тым, каго ў мірны час апаліла вайна.

Дзякую вам за мужнасць і стойкасць, актыўную і адказную грамадзянскую пазіцыю.

У дзень памяці і смутку жадаю вам, дарагія воіны-інтэрнацыяналісты, вашым родным і блізкім міру, шчасця, здароўя, поспехаў у працы на карысць нашай Радзімы.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь
Аляксандр ЛУКАШЭНКА

Памяць Афгана

Сёння ў нашай краіне адзначаецца 18-я гадавіна вываду савецкіх войскаў з Афганістана. У рамках Дня памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў 15 лютага ў Мінску на «Востраве мужнасці і смутку» ля Траецкага прадмесця а 11-й гадзіне пройдзе традыцыйны ўрачысты мітынг. Да помніка будуць ускладзены вянкі, а інвалідам афганскай вайны ўручаць ключы ад аўтамабіляў. Удзельнікі акцыі змогуць пакаштаваць салдацкай кашы на палявой кухні і паглядзець паказальныя выступленні авіямадэлістаў клуба «Салдаты Перамогі». У гэты ж дзень урачыстыя мерапрыемствы таксама адбудуцца ў Мар'інай Горцы, у Магілёве і іншых рэгіёнах рэспублікі.

З 17 па 18 лютага Беларускі саюз ветэранаў вайны ў Афганістане сумесна з Міністэрствам абароны і прыватнымі спонсарамі правядзе аўтакруіз Мінск—Барысаў—Орша—Віцебск—Полацк (па шляху следавання аўтакалоны ў кожным горадзе адбудзецца мітынг). Аўтакруіз стартуе а 9-й гадзіне на плошчы Перамогі, а ўдзел у ім возьмуць каля 20 машын. На «Лініі Сталіна» будзе арганізавана рэканструкцыя зімовай бітвы, а ў Оршы, ля помніка Івану Флёраву, выстаўлена легендарная «Кацюша». На канцавым прыпынку, на полі воінскай славы ў Полацку, запланаваны дэманстрацыя ваеннай тэхнікі і феерверк.

Паводле слоў Аляксандра Галубовіча, старшыні апякунскага савета і культуролага фонда «Памяць Афгана», ушанаванне памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў — гэта не толькі наш сыноўскі абавязак, даніна памяці тым, хто абараняў нашу Айчыну, але і грамадзянскае, ваенна-патрыятычнае выхаванне беларускай моладзі і лепшы спосаб выклікаць у іх цікавасць да гістарычных ваенных помнікаў.

Ірына ПРЫМАК.

Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Гурбангулы Бердымухамедава

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Гурбангулы Бердымухамедава з выбраннем прэзідэнтам Туркменістана. «Рэспубліка Беларусь цэніць Туркменістан як свайго важнага і надзейнага партнёра», — падкрэсліваецца ў віншаванні. Аляксандр Лукашэнка выказаў перакананасць у тым, што і ў далейшым двухбаковае ўзаемадзеянне будзе заснавана на прынцыпах узаемнай павагі і дружбы.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Новы прэзідэнт Туркменістана зрабіў першыя палітычныя заявы

У цырымоніі інаўгурацыі новага прэзідэнта Туркменістана Гурбангулы Бердымухамедава прыняла ўдзел дэлегацыя Рэспублікі Беларусь на чале са старшынёй Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Уладзімірам Канаплёвым.

У час інаўгурацыі Гурбангулы Бердымухамедаў зрабіў першыя палітычныя заявы. Ён сказаў, што Туркменістан прадоўжыць сваю палітыку па выкананню ўсіх узятых на сябе міжнародных абавязацельстваў, а таксама палітыку па вываду энергарэсурсаў на міжнародныя рынкі. «У гэтай сферы мы будзем прадаўжаць супрацоўніцтва з іншымі краінамі», — заявіў Гурбангулы Бердымухамедаў.

БЕЛТА.

«Прыйшлі Грамніцы — скідай рукавіцы!»

Сёння, 15 лютага, Праваслаўная царква адзначае вялікае двунадзесятае непераходзячае свята — Стрэчанне Госпада нашага Ісуса Хрыста (Грамніцы).

Адметнасцю свята з'яўляецца асаблівы чын асвячэння стрэчанскіх свечак, якія называюцца ў народзе грамнічнымі, а само свята — Грамніцамі. Запаленая свечка сімвалізуе ачышчальную сілу малітвы. Таму вернікі выкарыстоўваюць грамнічныя свечкі ў асаблівыя моманты свайго жыцця на працягу года. Але ці не галоўным прызначэннем грамнічных свечак з'яўляецца ахова дома. Сяляне іх запальваюць, калі пачынаецца навальніца, і моляцца, каб маланка не спаліла хату.

Яшчэ адна сустрэча звязаная з гэтым днём. У народным календары 15 лютага — сустрэча зімы з летам, пачатак прадвесня, а значыць, трэба рыхтавацца да палявых работ. Нашы дзяды заўважалі: «Калі на Грамніцы певень з-пад страхі нап'ецца вадзіцы, то на Юр'я вол пад'есць травіцы».

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

ХАБАР НЕ ПРАЙШОЎ

Палюбоўна разысціся прапанаваў жыхар Баранавіч участковаму Клецкага РАУС: за гэта і хабар нават даваў...

Праўда, «здзелкі» не атрымалася: праваахоўнік адмовіўся. Паводле даных аддзела інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Мінаблвыканкама, 39-гадовага мужчыну ўчастковы затрымаў у адміністрацыйным будынку сельгасвытворчага кааператыва «Грыцэвічы», дзе дзялок рэалізоўваў ювелірныя вырабы з серабра. Каб «разруліць» сітуацыю, затрыманы прапанаваў у якасці хабару 280 тысяч рублёў. У затрыманага канфіскавана 177 ювелірных сярэбраных вырабаў.

Ігар ГРЫШЫН.

«КАНВЕРТ».

З АДМОВАЙ АД ГАРАНТЫЙ

Праблемы выплат заробкаў у канвертах не пазбегла ніводная краіна свету. Паводле спецыяльных даследаванняў, сёння практыку разлікаў з работнікамі па «шэрых» схемах выкарыстоўваюць ад 25 да 50 працэнтаў кампаній у Расійскай Федэрацыі і да 85 працэнтаў — у Латвіі. На жаль, не з'яўляецца тут выключэннем і Беларусь, прычым асабліва часта падобныя выпадкі сустракаюцца ў сферы малога бізнэсу. Між тым, на думку ўдзельнікаў «круглага стала» з удзелам прадстаўнікоў Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, Міністэрства па падатках і зборах, а таксама Камітэта дзяржкантролю, вынікам падобнага «ўхілення» ад падаткаабкладання становяцца не толькі страты бюджэту. Не менш важна іншае — кожны грамадзянін, які пагаджаецца на «канверт», заўсёды рызыкуе пакараць сябе сам.

«Чорныя дзіркі» — будаўніцтва і гандаль

Недаатрыманне падаткаў у выніку «канвертных» разлікаў з работнікамі — толькі бачная частка айсберга. Адначасова «шэрыя выплаты» ўплываюць на ценявы абарот тавараў і аказанне ценявых паслуг. А ў сваю чаргу гэта — зноў-такі страты бюджэту. І страты значна большыя. Таму, паводле слоў намесніка начальніка ўпраўлення арганізацыі кантрольнай работы Міністэрства па падатках і зборах Ларысы Шыбко, сітуацыі з легальнасцю зарплаты надаецца асаблівая ўвага. Вядома, што сам па сабе «канверт» — ужо апошняе звяно ланцужка. Спачатку ж наймальніку трэба яшчэ атрымаць «няўлічаную наяўнасць». І гэта — адна з магчымасцяў папярэджанняў неафіцыйных разлікаў. У прыватнасці, паведаміла Ларыса Шыбко, летась пры правядзенні больш за 46 тыс. праверачных рэйдаў з ценявога абароту было спагнана грашовых сродкаў і таварна-матэрыяльных каштоўнасцяў на суму звыш 36 млрд рублёў. Прычым перш-наперш парушэнні адзначаліся ў сферы будаўніцтва і гандлю.

Праўда, шэрыя выплаты — гэта не толькі наступствы няўлічаных тавараў і паслуг. Як падкрэсліў начальнік аддзела аператыўнага кіравання дэпартамента фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржкантролю Аляксей Дзям'янаў, сёння вядомыя і іншыя «схемы» — абнаяўленне сродкаў праз падстаўных асобаў, даходы ад незаконнай прадпрымальніцкай дзейнасці, неабгрунтавана налічаныя прэміяльныя, налічэнне заробкаў грамадзянам, якія на справе не працуюць у арганізацыі. Ці, кажучы інакш, «мёртвым душам».

Як заўважыў Аляксей Дзям'янаў, у адносінах да наймальнікаў, што выкарыстоўваюць падобныя схемы, ужываюцца эканамічныя санкцыі. А ў асобных выпадках парушальнікі могуць прыцягвацца да крымінальнай адказнасці. І, да слова, летась было заведзена 811 падобных спраў.

«Падказка». І не толькі

Зразумела, што паставіць падатковага інспектара каля кожнага наймальніка немагчыма. Таму, мяркуюць падаткавікі, пэўную дапамогу тут могуць аказаць тыя ж мясцовыя органы ўлады ці прафсаюзы. А таксама — непасрэдна... атрымальнікі «канвертаў». Так, не сакрэт: ужо некалькі гадоў запар працуе «тэлефон даверу» Міністэрства па падатках і зборах, а таксама сайт міністэрства — пры жаданні, усю «пікантную» інфармацыю можна паведаміць праз іх. І пры гэтым на ўмовах поўнай ананімнасці.

Адначасова, заўважыла начальнік упраўлення падаткаабкладання грамадзян, дэкларавання даходаў і маёмасці Міністэрства па падатках і зборах Марына Грыгарчук, адным з перспектыўных у гэтым плане можа стаць распрацоўка заканадаўчага акта, на падставе якога з'явіцца магчымасць не выкарыстоўваць санкцыі да фізічнай асобы, якая паведаміць аб «канвертных» атрыманнях. Аднак пры ўмове, што такое паведамленне адбудзецца загадзя — яшчэ да прыходу праверкі.

Зрэшты, «падказкі» работнікаў — шлях да выяўлення парушэнняў не адзіны. Да прыкладу, для гэтага можа выкарыстоўвацца практыка кантрольных закупак. Або... супастаўленне расходаў грамадзян з іх афіцыйнымі даходамі. Права на падобную зверку ў падаткавікоў ёсць.

— Калі выявіцца, што памер даходу грамадзяніна аказаўся значна меншым за яго расходы, і ў тым ліку — за расходы на набыццё маёмасці, мы заўсёды прапануем чалавеку патлумачыць прычыну падобных разыходжанняў, — зазначыла Марына Грыгарчук. — І калі больш-менш лагічных тлумачэнняў няма, то сума перавышэння расходаў над даходамі падлягае падаткаабкладанню. У прыватнасці, летась такім чынам было праверана звыш 3,5 тыс. фізічных асобаў. Прычым агульная сума перавышэння іх расходаў над даходамі склала 6 млрд, а сума «даналічагага» падаходнага падатку — каля 1 млрд рублёў.

100 пішам. 500... маем на ўвазе?

Атрымаць зарплату і пры гэтым не заплаціць падаткі — варыянт заўсёды спакуслівы. І, як заўважыў дырэктар дэпартамента дзяржаўнай інспекцыі працы Анатоль Садаўнічы, сапраўды, сустракаюцца выпадкі, калі ў «шэрых» схемах вінаваты выключна наймальнік, які прымае да сябе работніка, бярэ ў яго працоўную кніжку, але пры гэтым не афармляе прыём афіцыйна. Аднак падобныя сітуацыі падаюцца хутчэй выключэннем з агульнага правіла. Часцей жа за ўсё выпадае весці гаворку аб «узаемнай згодзе». Работнік і наймальнік свядома дамаўляюцца аб падзеле зарплаты на дзве няроўныя часткі. Адна з іх, «па ведамасці», нярэдка вызначаецца на ўзроўні мінімалкі. Тады як другая, «канвертная», з'яўляецца на сутнасці асноўнай і вымяраецца сотнямі, а то і тысячамі доларaў.

Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

Такі варыянт нібыта задавальняе кожнага. Аднак да пэўнага часу. Скажам, якраз з-за невысокай «легальнай» часткі многія работнікі фактычна не могуць карыстацца крэдытамі, і ў тым ліку — на будаўніцтва жылля. Але яшчэ горш атрымліваецца сітуацыя, калі работнік захварэў, атрымаў траўму ці загінуў пры выкананні сваіх працоўных абавязкаў. І бальнічныя, і выплаты пацярпелым у выніку няшчасных выпадкаў на вытворчасці шчыльна «прывязаны» да зарплаты. Прычым да зарплаты, якая «праходзіць» па ведамасці.

Пенсія — не толькі старасць

Сацыялагічныя даследаванні ў суседняй Расіі прынеслі даволі нечаканы вынік — высветлілася, што аб памеры сваёй будучай пенсіі задумваецца ўсяго 19 працэнтаў работнікаў ва ўзросце ад 19 да 35 гадоў. У Беларусі падобных даследаванняў не праводзілася і тым не менш, без вялікай рызыкі памыліцца, можна сцвярджаць — большасць нашых суайчыннікаў таксама выбіраюць за лепшае жыць выключна «сённяшнім днём». Праблема, аднак у іншым. Паводле слоў начальніка галоўнага ўпраўлення пенсійнага забеспячэння і сацыяльнага страхавання Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Валянціны Каралёвай, мала хто ўлічвае той факт, што пенсія — не абавязкова старасць.

Жыццё ёсць жыццё, і тут магчыма ўсё. Чалавек можа стаць інвалідам і ў маладым узросце. Або тая ж маладая сям'я можа страціць карміцеля. Далей у абодвух выпадках часцей за ўсё адбываецца зварот за пенсіяй — адпаведна, па інваліднасці ці па страце карміцеля. Пры гэтым сам памер такіх пенсій залежыць ад сумы выплачаных узносаў на дзяржаўнае сацыяльнае страхаванне. А, натуральна, сума ўзносаў — ад «афіцыйнай» зарплаты. Такім чынам, пенсія па інваліднасці ці па страце карміцеля можа атрымацца нізкай. І нейкім чынам змяніць сітуацыю тут ужо немагчыма.

Аналагічны малюнак і з пенсіямі па ўзросту. Як заўважыла Валянціна Каралёва, зараз пенсія грамадзяніна, які атрымлівае па ведамасці зарплату ў 1 млн рублёў, складзе каля 300 тысяч. А вось пенсія чалавека, які мае той жа мільён, аднак з яго толькі 300 тысяч афіцыйна, а 700 тысяч — у «канверце», будзе ўжо ўдвая меншай. Розніца адчувальная. І асабліва калі ўзяць пад увагу тую акалічнасць, што з прычыны ўзросту і стану здароўя пенсія была і застанецца галоўнай крыніцай даходаў пераважнай большасці пенсіянераў.

Сяргей ГРЫБ.

Грып ужо ў сталіцы?

Як паведамілі карэспандэнту «Звязды» ў аддзяленні імунапрафілактыкі і эпіднагляду за паветрана-кропельнымі інфекцыямі Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя, з 5 па 11 лютага ў кантрольных гарадах па медыцынскую дапамогу з сімптомамі прастуды і грыпу звярнуліся 51 тыс. 438 чалавек. У параўнанні з папярэднім тыднем захворваемасць на ВРЗ і грып павялічылася на 7 працэнтаў. Сярод захварэлых большая палова — дзеці.

13 лютага ўпершыню трохразовае перавышэнне эпідпарогу было зарэгістравана ў Мінску, Маладзечне і Наваполацку. Праўда, пасля выхадных многія спяшаюцца звярнуцца ў свае паліклінікі. Таму ніхто са спецыялістаў з высновамі не спяшаўся. Але 14 лютага ў Мінску і Маладзечне эпідпарог зноў быў перавышаны. Паведамленне аб перавышэнні эпідпарога прыйшло таксама з Гомеля. А вось у Наваполацку сітуацыя ў аўторак стабілізавалася. Ці надоўга? Звычайна, пасля перавышэння эпідпарогу на працягу трох дзён запар у населеным пункце пачынае разгортвацца комплекс проціэпідэмічных мерапрыемстваў. Такім чынам у сталіцы ёсць усе шанцы першай здацца эпідэміі грыпу...

Надзея НІКАЛАЕВА.

КРАДЗЕЖ ПА РАСКЛАДУ

Кішэнныя крадзяжы ў метро для кагосьці вельмі прыбытковы бізнэс. Аднак абараніць сваю маёмасць магчыма — зладзеі ідуць «на справу» прыкладна ў адзін і той жа час і нават на адных і тых жа станцыях. Як расказаў намеснік начальніка АУС па ахове Мінскага метрапалітэна Уладзімір Шаруба, часцей за ўсё гэта непрыкметны мужчына ў 25—35 гадоў. Звычайна зладзеі арудуюць на станцыях «Плошча Леніна», «Кастрычніцкая», «Плошча Якуба Коласа» і «Інстытут культуры», выбіраючы першы або апошні вагоны — яны, як правіла, самыя людныя. Сярод дзён тыдня зламыснікі аддаюць перавагу панядзелку і чацвяргу. А вось нядзелю яны не прывячаюць — адпаведна, крадзяжоў у гэты дзень адбываецца менш.

Іна ПАЛЮХОВІЧ, *«Мінск—Навіны».*

НА АДНАГО ХЛОПЦА — 10 ДЗЯЎЧАТ

Студэнткі Гродна адзначылі Дзень Святога Валянціна масавым пацалункам. Аб гэтым паведамілі ў аддзеле па справах моладзі Гродзенскага гарвыканкама.

У Гродне дзень закаханых сустрэлі пацалункам каля 500 студэнтак вучылішча алімпійскага рэзерву, гандлёвага і політэхнічнага каледжаў. На новым месце цераз раку Нёман яны на вачах ва ўсіх цалаваліся з прахожымі хлопцамі. Аднак на кожнага хлопца прыйшлося па 10 дзяўчат. У выніку кожная 10-я чакала свайго пацалунка на месце, які прадзімаўся халодным ветрам, каля трох гадзін. 50 гродзенскіх дзяўчат гэты абрад паўтарылі сёння ў цэнтры польскай сталіцы — на месце каля Каралеўскага замка. Дзеля гэтага райкам БРСМ Гродна арганізаваў паездку ў Варшаву, удакладнілі ў гарвыканкаме.

Рычард САЛАТА, БЕЛТА.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

НА ЛІДСКАЙ «ЛАКАФАРБЕ» БЫЛО ЎЗГАРАННЕ

Учора ў 7.52 у цэнтр аператыўнага кіравання дыспетчару пажарнай аварыйна-выратавальнай часці паступіў сігнал: у адным з цэхаў ААТ «Лакафарба» г. Ліды канцэрна «Белнафтахім» узгаранне кандэнсатара намарожвання.

На адкрытай тэхналагічнай пляцоўцы, як устанавілі прыбыўшыя ў 7.59 разлікі, гарэлі тры калоны вышынёй 6 метраў кожная. У 8.15 пажар быў лакалізаваны, а ў 8.23 — ліквідаваны. Агнём пашкоджаны адзін працуючы кандэнсатар і два непрацуючыя з васьмі. Пацярпелых, на шчасце, не было. Як мяркуецца, прычынай пажару стала самаадвольнае ўзгаранне ў выніку збою тэхналагічнага працэсу.

Сяргей РАСОЛЬКА.

НА МЯЖЫ З РАСІЯЙ АЎТАМАБІЛЬНЫЯ ЧЭРГІ

Як паведамілі «Звяздзе» ў прэс-службе Дзяржаўнага мытнага камітэта нашай краіны, расійскі бок зноў вярнуўся да заганнай практыкі часовага афармлення аўтамабіляў з беларускімі нумарамі.

Нагадаю, што на пачатку студзеня гэтага года расіяне ўжо ўзводзілі аналагічную «бюракратычную заслону» для беларусаў, абавязаўшы нашых грамадзян пры перасячэнні мяжы афармляць увоз аўтамабіляў. Неўзабаве гэтая працэдура была адменена расійскім бокам, але, як аказалася, не надоўга. Зараз беларусам зноў даводзіцца афармляць на мяжы з РФ часовы ўвоз аўтамабіля, затрачваючы на гэта каля 30 хвілін і 100 расійскіх рублёў.

Мікола ДЗЯБЁЛА.

АЎТАМАБІЛЬНАЯ АВАРЫЯ НА ДАРОЗЕ ГОМЕЛЬ—БРЭСТ

Фота Сяргея ХАЛАДЗІЛІНА, БЕЛТА.

13 лютага, падчас моцнага снегападу, на аўтадарозе Гомель—Брэст каля вёскі Каростань Рэчыцкага раёна перакуліўся аўтамабіль ЗіЛ-130. Ні вадзіцель, ні экспедытар прадпрыемства «Рэчыцаміжрайтранс» не пацярпелі, аднак амаль цэлую гадзіну быў перакрыты рух аўтатранспарту і разбіта ўсё спіртное, якое прызначалася для сельскіх магазінаў Рэчыцкага раёна.

БЕЛТА.

СХАВАЛА НА ГАРЫШЧЫ

У гарадскую бальніцу Брэста паступіла 15-гадовая дзяўчына — вучаніца восьмага класа. Дактары звярнулі ўвагу, што ў пацыенткі паслародавая траўма.

Затым высветлілася, што школьніца нарадзіла дзіця і схавала яго на гарышчы. Праз 4 дні мёртвае немаўля знайшлі бацькі дзяўчынкі. Вучаніца лечыцца ў гінекалагічным аддзяленні, а пракуратура правядзіць праверку.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

ПРЫХАПІЎ

Вадзіцель Баранавіцкай цэнтральнай паліклінікі заліў у сваю «кішэню» 520 літраў бензіну, якія прызначаліся для службовай аўтамашыны.

Вось і не дзіўна, што дактарам іншым разам да хворых даводзіцца дабірацца пешшу. Узбуджана крымінальная справа.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

З СЯКЕРАЙ НА ФЕЛЬЧАРА

Непрыемнай нечаканасцю скончыўся выезд псіхіятрычнай брыгады станцыі хуткай медыцынскай дапамогі на выклік у гарадскі пасёлак Арэхаўск: «кліент» сустрэў медыкаў з сякерай...

Як паведамілі карэспандэнту «Звязды» ва ўпраўленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў МУС, здарэнне зафіксавана а палове шостай вечара. Жыхарка пасёлка, інвалід II групы, да якой прыбыла псіхіятрычная брыгада станцыі хуткай медыцынскай дапамогі, напала з сякерай на фельчара і прычыніла яму рубленую рану галавы. Пацярпелы быў змешчаны ў бальніцу, а нападаўшая — у псіхіятрычнае аддзяленне гарадской бальніцы.

Ігар ГРЫШЫН.

Нафта для Беларусі пойдзе праз Літву?

Учора, 14 лютага, адбылася першая прэс-канферэнцыя для беларускіх журналістаў новага Надзвычайнага і Паўнамоцнага пасла Літоўскай Рэспублікі ў Беларусі Эдмінаса Багдонаса.

У 2006 годзе тавараабарот паміж дзвюма краінамі склаў 600 млн долараў ЗША. На думку пасла, гэтая лічба не адпавядае патэнцыялу і магчымасцям, якія маюцца. Пры гэтым Эдмінас Багдонас адзначыў, што літоўскі капітал гатовы прыйсці ў Беларусь, але літоўскі бок для гэтага «хацеў бы мець як мага больш гарантый» для сваіх інвестыцый.

Пасол заявіў таксама, што зараз у Літве абмяркоўваецца пытанне аб магчымасці зрабіць прапанову Беларусі выкарыстоўваць інфраструктуру краіны для дастаўкі нафты праз Клайпедскі порт. Дастаўляцца нафта з трэціх краін у Беларусь можа чыгуначным транспартам альбо з дапамогай існуючага ў Літве нафтаправода. Аднак у апошнім выпадку «трэба зрабіць вельмі шмат тэхнічных удасканаленняў» трубаправода.

«Афіцыйнай прапановы (беларускаму боку. — **Аўт.**) яшчэ не было, мы разглядаем гэтую магчымасць», — сказаў пасол. Пры гэтым ён дадаў, што пры пастаўцы нафты праз Клайпедскі порт з трэціх краін Беларусь атрымала б «немалы працэнт неабходнай для спажывання нафты».

Эдмінас Багдонас сказаў таксама, што зараз існуе праект чатырох краін (Літвы, Латвіі, Эстоніі і Польшчы) па будаўніцтву ў Вісагінасе (Літва) новай атамнай электрастанцыі. «Аднак мы яшчэ не вызначыліся, якія рэактары набываць і колькі». Пры гэтым, на думку пасла, «элементарная логіка падказвае», што ў сітуацыі, калі Беларусь плануе распачаць будаўніцтва сваёй АЭС, дзве краіны маглі б дамагчыся скідак на цану абсталявання для станцыі, калі б рабілі сумесны вялікі заказ. «Але канкрэтных перамоў паміж Беларуссю і Літвой яшчэ няма».

У бліжэйшы час Літва павінна ўступіць у Шэнгенскую зону. У сувязі з гэтым у Мінску пачалося будаўніцтва прыбудовы да пасольства, каб у будучым забяспечыць абслугоўванне жадаючых атрымаць візы згодна з правіламі Шэнгена. Сёння ж пасольства ў Мінску выдае кожны дзень 600—700 віз. Літоўскі бок мае планы таксама набыць участак зямлі ў Гродне (у гэтым горадзе знаходзіцца Генеральнае консульства Літвы), каб пабудаваць дадатковыя плошчы і забяспечыць выдачу віз грамадзянам Гродзеншчыны згодна з правіламі Шэнгена.

Гаворачы пра палітычны дыялог паміж Літвой і Беларуссю, Эдмінас Багдонас адзначыў, што «Літва, як член ЕС, падтрымлівае палітыку ЕС». Пры гэтым Літва чакае канкрэтных прапаноў ад беларускага боку па супрацоўніцтву з Захадам і «хацела б быць першым «адвакатам» Беларусі ў Бруселі і ў іншых міжнародных структурах».

Сяргей КУЗНЯЦОЎ.

Пытальнік

Звыш нормы. Якая кампенсацыя?

— У мяне, як і, напэўна, у іншых работнікаў сельскай гаспадаркі, ёсць некалькі пытанняў наконт працягласці працоўнага часу. Такім чынам, колькі можа працягвацца так званы ненармаваны працоўны дзень, як аплачваюцца «перапрацоўкі» і, нарэшце, як павінен весціся сам улік працоўнага часу?

Ул. А. ДОЎБІН, *Бярэзінскі раён.*

Пытанне падалося на самай справе цікавым. Таму на тлумачэнні мы вырашылі звярнуцца ў Беларускі прафсаюз работнікаў АПК. Пры гэтым, як зазначыў яго старшыня Уладзімір Навумчык, Працоўны кодэкс сапраўды прадугледжвае магчымасць прыцягнення работнікаў да выканання работы за межамі вызначанага для іх заканадаўствам працоўнага часу. І тут, па-першае, можа мецца на ўвазе звышурочная работа, а, па-другое, — работа на ўмовах ненармаванага працоўнага дня. Два гэтыя варыянты атрымалі самастойнае прававое рэгуляванне. Прычым Працоўны кодэкс па сутнасці не ўтрымлівае палажэнняў, якія вызначаюць якія-небудзь «рамкі» ненармаванага працоўнага дня. Артыкул 158 Кодэкса прадугледжвае толькі падставу кампенсацыі гэтай работы звыш нармальнай працягласці працоўнага часу прадастаўленнем дадатковага водпуску.

Дарэчы, у Парадку прадастаўлення і суміравання працоўных водпускаў, які зацверджаны пастановай Савета Міністраў ад 27 ліпеня 2000 года №1154 з далейшымі зменамі і дапаўненнямі, рэгламентаваны пытанні прадастаўлення дадатковых водпускаў за ненармаваны працоўны дзень, а таксама вызначана адрозненне гэтага віду перапрацоўкі ад звышурочных работ. Так, згодна з пунктам 5 узгаданага Парадка, работа, выкананая звыш вызначанай працягласці працоўнага часу работнікам, якім устаноўлены ненармаваны працоўны дзень, не лічыцца звышурочнай. Таму кампенсацыя за перапрацоўку пры ненармаваным працоўным дні робіцца не па правілах звышурочных работ, а шляхам прадастаўлення дадатковага водпуску працягласцю да 14 каляндарных дзён (артыкул 158 Працоўнага кодэкса).

Адначасова, нагадалі ў прафсаюзе, Міністэрствам сельскай гаспадаркі і харчавання быў зацверджаны пералік работнікаў з ненармаваным працоўным днём у галіне. У сваю чаргу, на падставе гэтага пераліку міністэрства, з улікам ступені напружанасці і складанасці працы, а таксама неабходнасці прыцягнення работнікаў да выканання работ звыш вызначанай працягласці працоўнага дня, у асобных арганізацыях складаюцца свае адпаведныя пералікі, у якіх вызначаецца канкрэтная працягласць дадатковага водпуску для асобных катэгорый работнікаў. Гэты пералік афармляецца як дадатак да калектыўнага дагавора. Прычым наймальнік не мае права пашыраць пералікі работнікаў з ненармаваным працоўным днём, зацверджаныя ва ўстаноўленым парадку. Такім чынам, ва ўзгаданыя пералікі не ўключаюцца пасады, работа на якіх не выклікае неабходнасці яе выканання звыш вызначанай нормы працоўнага часу.

Да слова, для прыцягнення да работы на ўмовах ненармаванага працоўнага часу неабходна распараджэнне наймальніка ў любой форме — да прыкладу, загад. Прычым прыцягненне да такой работы магчыма толькі ў выпадку неабходнасці (інакш кажучы, павінны існаваць пэўныя падставы ці стварыцца пэўная сітуацыя, пры якой ўзнікае неабходнасць занятасці работнікаў звыш «нармальных» 40 гадзін у тыдзень), і да таго ж прыцягваць да работы на ўмовах ненармаванага часу можна выключна эпізадычна, час ад часу. І яшчэ. Як падкрэсліваюць у прафсаюзе, у любым выпадку ва ўмовах ненармаванага дня работнік павінен выконваць выключна свае працоўныя функцыі. А ў сваю чаргу пад працоўнымі функцыямі маецца на ўвазе работа па пэўнай спецыяльнасці, кваліфікацыі ці пасадзе.

Нарэшце, варта адзначыць такі момант. Улік фактычнага працоўнага часу вядзецца ў табелі выкарыстання працоўнага часу. Табель складаецца для кантролю за выкананнем вызначанага правілам ўнутранага працоўнага распарадку ці графікам работ рэжыму працоўнага часу, а таксама для атрымання звестак аб адпрацаваным часе кожным работнікам. Як правіла, табель складаецца ў адным экзэмпляры спецыяльна ўпаўнаважанай асобай (табельшчыкам, брыгадзірам, загадчыкам фермай ці іншым супрацоўнікам) і пасля адпаведнага афармлення ва ўсталяваныя наймальнікам тэрміны перадаецца ў бухгалтэрыю. Прычым у складзе адпрацаванага часу ў табелі павінны асобна адлюстроўвацца колькасць гадзін работы ў выхадныя, нерабочыя святочныя дні і ў начны час.

ISSN 1990-763X

9 771990 763008

КУРСЫ ВАЛЮТ

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 15.02.2007 г. (для б/н разлікаў)

1 долар ЗША	2 141,00
1 еўра	2 803,43
1 латвійскі лат	4 023,30
1 літоўскі літ	812,14
1 чэшская крона	99,29
1 польскі злоты	716,72
1 расійскі рубель	81,39
1 украінская грыўня	426,83

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў

Цэнтрабанк РФ

USD	26,3060
10 UAH	51,9358
1000 BYR	12,2304
EUR	34,3688

Курс у гандлёвых кампаніях (на 14.02.2007 г.)

USD ..... 2220 / 2320

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпісьцеся на часопіс «Главный бухгалтер. ГБ» на 2007 год у радкасці па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

Прапрацоўваецца пытанне аб скарачэнні колькасці супрацоўнікаў органаў унутраных спраў Беларусі на 2 тысячы чалавек

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 13 лютага прыняў з дакладам міністра ўнутраных спраў Уладзіміра Навумава. Кіраўнік дзяржавы праінфармаваны аб выніках работы органаў унутраных спраў за 2006 год. Міністр адзначыў, што ў мінулым годзе значна скарацілася колькасць асабліва цяжкіх і цяжкіх злачынстваў. Зменшылася колькасць злачынстваў, учыненых непаўналетнімі. Разам з тым ёсць і шэраг праблемных пытанняў.

Паводле слоў Прэзідэнта, неабходна больш пільную ўвагу ўдзяліць пытанням бяспекі дарожнага руху ў адпаведнасці з патрабаваннямі Дырэктывы № 1. З 1 сакавіка ўступае ў дзеянне новы Кодэкс аб адміністрацыйных правапарушэннях. Да пачатку сакавіка органы ўнутраных спраў і іншыя дзяржаўныя органы павінны правесці шырокую растлумачальную работу сярод насельніцтва адносна выканання Правілаў дарожнага руху. Увядзенне новага адміністрацыйнага кодэкса прызначана станоўча паўплываць на сітуацыю.

На сустрэчы таксама абмяркоўваліся пытанні аптымізацыі колькасці і структуры МУС. У прыватнасці, прапрацоўваецца пытанне аб скарачэнні колькасці супрацоўнікаў органаў унутраных спраў на 2 тыс. чалавек. Эканомленыя сродкі пойдуць на паляпшэнне тэхнічнай аснашчанасці органаў унутраных спраў.

Аляксандр Лукашэнка даў даручэнне прапрацаваць пытанне аб амністыі грамадзян, якія ўчынілі менш цяжкія злачынствы і сталі на шлях выпраўлення. Кіраўнік дзяржавы паставіў задачу ўзмацніць барацьбу з п'янствам, вырабам фальсіфікаваных спіртных напіткаў і самагону. Прэзідэнт даручыў узмацніць работу па ўмацаванню эканамічнай бяспекі краіны ў кантэксце нядаўна прынятай Дырэктывы № 2.

Паводле паведамленняў прэс-службы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і БЕЛТА.

Пачатковая цана не прададзеных на таргах аб'ектаў рэспубліканскай уласнасці будзе паніжацца

Пачатковая цана не прададзеных раней аб'ектаў рэспубліканскай уласнасці можа быць зніжана на 20 працэнтаў ад цаны аб'екта пасля першых нерэзультатыўных або неадбыўшыхся таргоў (аўкцыёну, конкурсу), да 50 працэнтаў уключна ад цаны аб'екта пасля другіх нерэзультатыўных або неадбыўшыхся таргоў, а таксама з прымяненнем метаду паніжэння пачатковай цаны. Адпаведны ўказ № 77 «Аб некаторых пытаннях паніжэння пачатковай цаны продажу маёмасці, што знаходзіцца ў рэспубліканскай уласнасці» Прэзідэнт Беларусі падпісаў 13 лютага.

Дакумент устанаўлівае механізм увядзення ў гаспадарчы абарот дзяржаўнай маёмасці ў выпадках, калі яе выкарыстанне ў межах дзяржаўнай уласнасці немэтазгоднае або малаэфектыўнае.

У прэс-службе адзначылі, што вопыт правядзення аўкцыёнаў, конкурсаў у рэспубліцы за апошнія гады сведчыць аб адносна нізкім попыце на аб'екты нерухомай маёмасці рэспубліканскай уласнасці, асабліва на не завершаныя будаўніцтвам аб'екты і аб'екты нерухомай маёмасці, размешчаныя ў сельскай мясцовасці. Высокі ацэначны кошт, непрывабнасць аб'ектаў, недастатковая ступень гатоўнасці (да 60 працэнтаў) прывялі да зніжэння зацікаўленасці ў куплі такіх аб'ектаў рэспубліканскай уласнасці.

Аўкцыён пачынаецца з аб'яўлення пачатковай цаны аб'екта (якая вызначаецца па яго ацэначнай вартасці на 1 студзеня гэтага года ў парадку, устаноўленым заканадаўствам).

Пачатковая цана паніжаецца ў адпаведнасці з аб'яўленым шагам аўкцыёну (у межах ад 5 працэнтаў да 15 працэнтаў ад папярэдняй названай аўкцыяністам цаны аб'екта) да моманту, калі адзін з удзельнікаў аўкцыёну пагодзіцца купіць аб'ект рэспубліканскай уласнасці па аб'яўленай аўкцыяністам цане, але не ніжэйшай за мінімальную. Мінімальная цана не можа быць ніжэйшая за 20 працэнтаў пачатковай цаны продажу аб'екта рэспубліканскай уласнасці, калі іншае не ўстаноўлена Прэзідэнтам Беларусі.

Пры гэтым паніжэнне пачатковай цаны продажу існуючых у рэспубліканскай уласнасці будынкаў, збудаванняў, ізаляваных памяшканняў (за выключэннем жылых дамоў і жылых памяшканняў), не завершаных будаўніцтвам капітальных будынкаў (акрамя не завершаных будаўніцтвам жылых дамоў і жылых памяшканняў), перадатачных устройстваў, іншай нерухомай маёмасці, машын, абсталявання, транспартных сродкаў, што адносяцца да асноўных сродкаў, павінна адбывацца паэтапна.

Указам зацвярджаецца і паляжэнне аб парадку продажу аб'ектаў рэспубліканскай уласнасці на аўкцыёнах з прымяненнем метаду паніжэння пачатковай цаны.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Прэзідэнт Беларусі наведаў студыю Тэатра песні Ірыны Дарафеевай

Вядомая выканаўца ўжо даўно запрашала кіраўніка дзяржавы пабываць у студыі, таму прыезд Аляксандра Лукашэнкі не стаў нечаканасцю.

Прэзідэнт агледзеў памяшканні, дзе працуе калектыў тэатра, паразмаўляў з выканаўцамі і музыкантамі. Аляксандр Лукашэнка пацікавіўся творчымі планамі Ірыны Дарафеевай. У размове закраналася і тэма развіцця беларускага эстраднага мастацтва, падтрымкі маладых талентаў. У студыі для высокага госця адбыўся імправізаваны канцэрт. Ірына Дарафеева выканала для Прэзідэнта песні, сярод якіх вядомыя хіты і новая — «Ой ли мой суженый».

Прагучалі і песні ў выкананні Георгія Калдуна — яшчэ аднаго ўдзельніка Тэатра песні Ірыны Дарафеевай. Дзве з іх спявак плануе прадставіць на фестывалі «Славянскі базар у Віцебску».

Папулярная выканаўца Ірына Дарафеева пачала кар'еру ў 12 гадоў на эстрадзе, стаўшы салісткай дзіцячага вакальна-інструментальнага ансамбля «Радуга». Спявачка прадстаўляла беларускае эстраднае мастацтва ў Бельгіі, Германіі, Люксембургу, Польшчы, Аўстрыі, Швейцарыі, Нідэрландах, Літве, Югаславіі, Балгарыі, Расіі, Украіне, на Кіпры.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Канферэнц-зала

ПІЦЬ і сядзець?

Вось у чым пытанне для аматараў кіраваць транспартнымі сродкамі ў стане алкагольнага альбо наркатычнага ап'янення.

Мінаюць часы, калі «бяспраўным» уладальнікам аўтамабіляў ці матацыклаў не было чаго губляць. Пакуль што асобы, пазбаўленыя вадзіцельскага пасведчання, пры паўторным кіраванні транспартным сродкам у нецвярозым стане рызыкуюць толькі сваім кашальком. Аднак з першага сакавіка, калі ўступіць у сілу новы Адміністрацыйны кодэкс, за такое правапарушэнне можна трапіць і за краты. Паводле яго слоў начальніка ўпраўлення прававога забеспячэння штаба МУС краіны Наталлі Бажко, аматары выпіць за рулём на першы раз будуць карацца штрафам у памеры ад 15 да 35 базавых велічынь і пазбаўляцца вадзіцельскага пасведчання на 3 гады. Калі ж на працягу года выпівохі не зробяць належных высноў і зноў сядуць за руль у нецвярозым стане, то будуць прыцягвацца да крымінальнай адказнасці. Дзеючым заканадаўствам прадугледжана для такіх асобаў пакаранне ў выглядзе арышту на 6 месяцаў альбо папраўчыя работы на тэрмін да 2 гадоў. На пытанне «Звязды», якая колькасць такіх парушальнікаў можа неўзабаве трапіць за краты, намеснік старшыні Вярхоўнага Суда Валерый Калінковіч адказаў, што прагнозы рабіць пакуль рана. Паводле слоў, летась за паўторнае кіраванне транспартнымі сродкамі ў нецвярозым стане судамі былі прыцягнуты да адміністрацыйнай адказнасці крыху больш за 9 тысяч чалавек. Нават калі сёлета колькасць злосных п'яніц за рулём не зменшыцца, гэта не азначае, што ўвесь гэты «кантынгент» аўтаматычна апынецца за кратамі, бо апошняе слова пры назначэнні меры пакарання будзе за суддзямі. Намеснік кіраўніка вышэйшай судовай інстанцыі краіны выказаў спадзяванне, што ўзмацненне мераў адказнасці прымусіць многіх вадзіцеляў зрабіць належныя высновы і адмовіцца ад шкодных звычкі кіраваць транспартнымі сродкамі ў нецвярозым стане.

На прэс-канферэнцыі прагучала таксама прапанова пазбаўляць выпівох права ўласнасці на транспартныя сродкі. Між іншым, такая практыка была ў нашай краіне амаль сорак гадоў таму, калі ў злосных парушальнікаў Правілаў дарожнага руху канфіскоўвалі дзесяткі аўтамабіляў і матацыклаў за год. Але прадстаўнік Вярхоўнага Суда катэгарычна выступіў супраць вяртання такой меры пакарання. На думку Валерыя Калінковіча, увядзення крымінальнай адказнасці дастаткова, каб астудзіць хмяльны пыл некаторых вадзіцеляў.

Мікола ДЗЯБЁЛА.

Фонд «Минскоблгосимущество»

27 марта 2007 года в 11.00 по адресу : г. Минск, ул. Чкалова, 5 проводит открытый аукцион по продаже объекта республиканской собственности, расположенного по ул. Центральная в д. Хотежино Минского района Минской области, закрепленного на праве оперативного управления за учреждением «Республиканский центр олимпийской подготовки конного спорта и коневодства».

НА АУКЦИОННЫЕ ТОРГИ ВЫСТАВЛЯЕТСЯ ЛОТ:

Здание кожевенного цеха с двумя пристройками.

Здание одноэтажное, фундамент бетонный, стены и перегородки кирпичные, крыша шиферная, полы бетонные, дощатые. Имеются электроснабжение, водопровод, канализация. Общая площадь здания — 264,8 кв.м, введено в эксплуатацию в 1983 году.

Лот расположен на земельном участке общей площадью 2535 га, предоставленном вышеназванному учреждению, согласно решению Минского райисполкома от 25 ноября 2004 г. № 2790. Победителю аукциона земельный участок будет предоставлен в установленном законодательством порядке.

Аукцион проводится без условий.

Начальная цена продажи — 33 197 393 рубля.

Сумма задатка — — 1 660 000 рублей.

Победитель обязан:

1. Подписать договор купли-продажи объекта в течение 10 календарных дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.

2. Произвести оплату объекта в течение 30 календарных дней с момента подписания договора купли-продажи разовым платежом.

Все расчеты по сумме задатка производятся путем перечисления их на расчетный счет фонда «Минскоблгосимущество» № 3632900000952 в ОПЕРУ АСБ «Беларусбанк» в г. Минске, код 795, ул. Мясникова, 32, УНН 100128686.

Заявки принимаются до 15.00 26 марта 2007 года.

По вопросам подготовки и проведения аукциона обращаться по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, комн. 329, тел.: 224-57-09, 502-20-60, 502-20-63.

ВЫ ЯШЧЭ НЕ Ў КІНАТЭАТРЫ?

ТАДЫ МЫ ЕДЗЕМ ДА ВАС!

Кіно ў сталіцы і кіно ў раённым цэнтры ці вёсцы — неба і зямля. У сталічных кінатэатрах амаль заўсёды няма куды пеўню дзюбнуць. Гэта, у першую чаргу, звязана з тым, што навінкі адразу паступаюць у Мінск. А да вёскі даходзяць (калі даходзяць) з вялікім спазненнем. Ды і экран у сталічных кінатэатрах (такое адчуванне, быццам ты ўдзельнічаеш у падзеях фільма, аж дрыжыкі бягуць па скуры) нават і блізка не стаяў з экранамі раённых кінатэатраў і сельскіх клубаў. Але, нягледзячы на гэта, і тут маюцца энтузіясты, фанаты сваёй справы.

Тэлефаную ветэрану кінафікацыі і вядомаму на міёршчыне паэту па сумяшчальніцтву Браніславу Марозу. Дамаўляюся аб сустрэчы.

— Кінатэатр «Колас». Дзверы справа ад школы, — тлумачыць голас на іншым канцы провада.

— Браніслаў Юльянавіч, а даўно вы працуеце кінамеханікам, — не ўтрымалася я, каб не задаць пытанне.

— Не, нядаўна (паўза)...

«Дзіўна, які ж ён тады ветэран», — пранеслася думка ў маёй галаве.

— ...52 гады, 9 з якіх на пенсіі (*смяецца*).

КАЛІ МАГАМЕД НЕ ІДЗЕ ДА ГАРЫ?..

Пераадолеўшы шэраг лесвічных прыступак, апынулася ў «святое святых» — месцы працы кінамеханіка. Колькі разоў наведвала кінатэатры, але ніколі не задумвалася, што па-за глядацкай залай існуе свой маленькі свет. Менавіта тут і «жыве» кінамеханік-чараўнік, які цераз маленькі квадрат акенца назірае за кінаманамі.

Спыняю погляд на скрынях з кінастужкай. Браніслаў Юльянавіч заўважыў цікаўны погляд і сумна прамовіў:

— Яна старая. З часу распаду Савецкага Саюза фільмафонд не на шмат абнавіўся. А любая кінастужка, бясспрэчна, з кожным годам страчвае сваю якасць.

Паводле слоў ветэрана кінафікацыі, умовы працы кінамеханіка ў вёсцы сапраўды складаныя. Гэта і састарэлая кінатэхніка, і недахоп новых фільмаў, і нізкая зарплата (бо амаль усе працуюць на паўстаўкі, а то і менш). З-за адсутнасці кадраў больш за паўтара года не працуе Дзісенскі кінатэатр, закрылася кінаўстанова ў Волкаўшчыне.

— Але, — з надзеяй у вачах зазначае мой суразмоўца, — зусім нядаўна створаны і пачынае дзейнічаць дэпартамент па кіно пры Міністэрстве культуры. На яго нарадзе ў Нацыянальнай бібліятэцы з дырэктарамі раённых і гарадскіх кінавідэаўстаноў рэспублікі было заяўлена, што ў вёскі, асабліва ў аграгарадкі, будзе паступаць найноўшая відэатэхніка (паказвае на DVD-магнітафон, які кантрастна выдзяляецца на фоне старой кінатэхнікі). Акрамя гэтага, у хуткім часе нашай кінасетцы павінны прадаставіць новы аўтамабіль. А нацыянальная кінастудыя «Беларусьфільм» абяцае парадаваць новымі айчыннымі фільмамі. Па-баявому настроены і наш **новы дырэктар Міёрскай раённай кінавідэасеткі Мікалай ПАЗНЯКОЎ.**

— Не жадаюць чамусьці міярчане наведваць кінатэатр,— гаворыць Мікалай Мікалаевіч. — Але калі Магамед не ідзе да гары, то гара прыйдзе да Магамеда.Так і мы. Вось плануем паказваць кіно на поўсюдзе ў абедзенны перапынак для супрацоўнікаў. Зараз праводзім анкетаванне. Густы розныя. Жанчыны аддаюць перавагу меладрамам, а мужчыны — баевікам.

КІНО НА КАЛЁСАХ ДЛЯ ДАРОСЛЫХ...

Работнікі раённай кінавідэасеткі стараюцца палепшыць кінаабслугоўванне насельніцтва. З ліпеня мінулага года аднавілася аўтапера-

Самыя ўдзячныя гледачы прыходзяць на кінасеансы са свайімі крэсламі.

соўка. Яна транслюе кінастужкі ў сельскіх клубах, школах, дзіцячых садках. За рулём аўтамашыны вопытны шафёр Міхаіл Ярохін. Менавіта ён рыхтуе відэаапаратуру да сеанса.

Кінамеханікам на аўтаперасоўцы ў вячэрні час працуе кінаінжынер Міхаіл Савіцкі. Улетку вячэрнія сеансы пачынаюцца пасля таго, як людзі прыгоняць з поля кароў. У зімовы час — раней...

...І НЕ ТОЛЬКІ

Браніславу Юльянавічу аўтаперасоўка дапамагае ў абслугоўванні дзіцячых садкоў і школ раёна.

Са школ паступаюць заявы на прагляд навукова-папулярных, патрыятычных і мастацкіх фільмаў. Для старэйшых школьнікаў сталі практыкаваць таксама кінастужкі па прафілактыцы СНІДу, алкагалізму, курэння, па пажарнай бяспецы.

— Школа № 1 горада Міёры заказала фільм «Знак бяды», які праходзяць па школьнай праграме. Я, у сваю чаргу, патэлефанаваў у трэцюю гарадскую школу і кажу: «Першая школа будзе глядзець, а вы чым горшыя?» — «Так? Безумоўна, вязіце і нам», — пачуў у адказ.

Вялікай папулярнасцю карыстаўся фільм «Я помню» беларускага рэжысёра Сяргея Сычова, які на міжнародным кінафестывалі «Лістапад-2006» атрымаў «бронзу». Паводле слоў кінамеханіка, яго паглядзелі больш як тысяча школьнікаў горада.

У дзіцячыя садкі возяць часцей за ўсё народныя казкі і кароткаметражныя мультфільмы. Заўважыла, што нават самыя маленькія дзеці не страчваюць цікавасці, калі героі мяняюцца прыкладна кожныя дзесяць хвілін.

— Пацешна назіраць за малымі, калі яны шчыра радуюцца ці сядзяць важна склаўшы рукі, як дарослыя. Найбольшай папулярнасцю карыстаецца Чабурашка. Тут нават гук не патрэбны, бо дзеці спяваюць самі.

Маюцца і праблемы. У горадзе — дзве крамы і тры кіёскі па продажу DVD-дыскаў. У нядзелю ж на кірмаш прыязджае цэлая машына з дыскамі. А чаму б і не парадаваць малога сына ці дачку і не купіць дыск з мульцікамі? Купляюць.

— Вось і падыходзіць, часам, да мяне «ўнучок» (*так я іх заву*) са словамі: «А я такі мульцік ужо дома глядзеў».

Пераканалася, сапраўды, любяць малыя Браніслава Юльянавіча. «Дзядуля, а вазьмі мяне на ручкі». Возьме аднаго, другога. А пасля ўсміхаецца і кажа: «Дзе ж я вас усіх 150 падыму. Давай, Міхалыч, — звяртаецца да шафёра, — падымай і ты».

ПРАМЕНЬ СОНЦА Ў ЦЁМНЫМ ЦАРСТВЕ

Правучыўся Браніслаў Юльянавіч дзевяць месяцаў у Рэспубліканскай школе кінамеханіка. І... стаў спецыялістам у вобласці гужавай кінаперасоўкі.

Быў недзе 56-ы год, калі ён скончыў вучыцца. У раёне тады не было электрычнасці. Кіно паказвалі пры дапамозе рухавіка, які ледзь падымалі двое мужчын. Асабліва складана было зімой, калі вада ў рухавіку замярзала. Пасля далі новы кіеўскі рухавік, які працаваў ужо без вады. Ён быў лягчэйшы і ахалоджваўся паветрам.

А яшчэ Браніслаў Юльянавіч сам рэкламу піша.
— Хочацца прывабіць як мага больш гледачоў, — гаворыць мой суразмоўца. — Калі фільм цікавы, дык я ўсім сваім знаёмым тэлефаную і рэкламу з радасцю развешваю. А калі ён «шэры», то і падманваць яркай рэкламай няма жадання.

— Ды і каня не было, — узгадвае Браніслаў Юльянавіч і цяжка ўздыхае. — Бывала, пачну прасіць у брыгадзіра: «Дай каня, трэба ў Блажках фільм паказаць». Упарціўся. Але, калі скажу, што партыя так распарадзілася — кіно паказваць у вёсцы, — саступаў.

Моладзі раней у вёсцы было шмат, чакалі кіно, як свята. Аднойчы ў Свярдлах на кінасеанс прыйшло ажно 77 дзяўчат. Але паўсюль была галеча, працавалі за палачкі, таму часцяком ў многіх не было нават двух рублёў, каб заплаціць за сеанс. Пускаў, бо было шкада і бабулю, якая прыйшла паглядзець «на кіно, як на дзіва», і закаханых, якія мелі два рублі на дваіх.

Нашаму герою тады было 17 гадоў, а яго паплечніку-матарысту — усяго толькі 14. Звычайна вазілі адзін фільм у 15 вёсак. Летам — добра. А вось зімой узнікалі праблемы з ежай і начлегам. Дзякуй Богу, людзі часцей за ўсё трапляліся добрыя: на начлег запросяць і нават грыбамі апошнімі падзеляцца.

— Моладзь вясёлая была, — расказвае з усмешкай на твары ветэран кінафікацыі. — Пасля сеанса ладзілі танцы. Бывала, так затанцуюць нас дзяўчаты, што на ногі раніцай устаць не маглі.

І вось Браніслава Юльянавіча вырашылі павысіць. Прызначылі кінаінжынерам. Такая праца на адным месцы не прыносіла задавальнення.

— Таму папрасіўся на сваё мінулае месца. Вось з таго часу і працую старэйшым кінамеханікам, — гаворыць Браніслаў Юльянавіч.

З КІНАЗАЛЫ — У ЗАГС

Нават з жонкай яго кінатэатр звязаў.

— Заўважыў аднойчы, як у кіназалу ўвайшлі дзве прывабныя дзяўчыны, — расказвае мой суразмоўца. — А вольных месцаў не было. Я выбег і прапанаваў ім скрыні з-пад кінастужкі. Адна з дзяўчат мне вельмі спадабалася. А я — ёй. Даведаўшыся, якія яна фільмы любіць, абяцаю ёй на наступны сеанс абавязкова прывезці нешта новае. Так і пачалі сустракацца. Праз паўгода ажаніліся. Вось ужо 46 гадоў «знаходжу».

Паводле слоў Браніслава Юльянавіча, кінаказа за час яго працы звязала лёсы не аднаго хлопца і дзяўчыны. Адбывалася гэта дзякуючы касіру.

— Прыехаў у калгас малады інжынер, — пачынае свой аповед кінамеханік. — Сарамлівы, сціплы. Вырашыў аднойчы схадзіць у кіно. Заўважыў на апошнім радзе прывабную незнаёмку. Падысці не адважыўся. Кожны дзень пачаў наведваць кінатэатр з марай, каб незнаёмка хоць раз села ля яго. І вось мара ажыццявілася. Раз, другі. Пасля 50 сеансаў маладыя ажаніліся.

А пры чым тут касір? Менавіта яна спецыяльна прадавала адзінокім хлопцам і дзяўчатам білеты на суседнія месцы. Многія з іх з яе лёгкай рукі з кінатэатра «адразу ж» накіроўваліся ў ЗАГС.

...

У мясцовага паэта ёсць мара. Не зусім звычайная. Гумарная. Такая ж, як і ён сам.

Было б, сябры, зусім нядрэнна,
Каб вецер знёс тэлеантэны.
Тады я жыў бы нібы пан.
Заўжды двайны даваў бы план.

Не паспеў Браніслаў Юльянавіч прадэкламаваць верш, як нашу размову прыпыніла бухгалтар кінасеткі Тамара Страмавусава. Калега завітала, каб перадаць распараджэнні начальства.

— А колькі зарабляе кінамеханік? — пацікавілася я.

— Наш Юльянавіч працуе на поўную стаўку. Атрымлівае не менш як 250 тысяч рублёў за месяц, — заявіла яна маю цікаўнасць.

Зарплата невялікая. Цяпер зразумела, чаму работнікі Міёрскай раённай кінасеткі называюць сябе «апошнімі з магікан». Але, нягледзячы на ўсе складанасці і перашкоды, аптымізму не губляюць. «Не ўсе яшчэ рэзервы выкарыстаны», — перакананы яны.

Надзея ДРЫЛА, фота аўтара.

Пытальнік

ЛЁС ГАНДЛЁВАЙ КРОПКІ НА ПРЫВАТНАЙ ЗЯМЛІ ВЫРАШАЮЦЬ ГАРАДСКІЯ ЎЛАДЫ

Яшчэ ў 2000 годзе ў вёсцы Кунцаўшчына я пабудаваў на ўласным зямельным участку гандлёвы ларок у якасці індывідуальнага прадпрымальніка. Атрымаў ліцэнзію на рознічны гандаль, якім і займаўся. Аднак, калі вёска ўвайшла ў склад Мінска, гэту ліцэнзію прыпынілі, бо адшукалі парушэнні ў мэтавым выкарыстанні зямельнага ўчастка. Я з гэтым катэгарычна не згодзен, бо лічу, што закон на маім баку.

С. Абакунчык, *г. Мінск.*

— Згодна з артыкулам 107 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб зямлі, усе землі горада выкарыстоўваюцца ў адпаведнасці з генеральным планам, які быў распрацаваны і зацверджаны на падставе горадабудаўнічай дакументацыі.

На тэрыторыі горада Мінска рэгуляванне зямельных адносінаў ажыццяўляецца Мінскім гарвыканкамам. Прадастаўленыя зямельныя ўчасткі павінны выкарыстоўвацца ў адпаведнасці з мэтай іх атрымання, у вашым выпадку — для будаўніцтва і абслугоўвання жылога дома. На зямельным участку, які прадастаўлены для будаўніцтва і абслугоўвання жылога дома, можна будаваць жылы дом з гаспадарчымі пабудовамі, якія прадугледжаны генпланам, — растлумачылі рэдакцыі спецыялісты Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Рэспублікі Беларусь. — Гандлёвая кропка можа быць установлена на зямельным участку, які прадастаўлены для будаўніцтва і абслугоўвання жылога дома, у адпаведнасці з зацверджанай горадабудаўнічай дакументацыяй на падставе рашэння Мінскага гарвыканкама.

Сяргей КУРКАЧ.

Дэмаграфічная бяспека

БУДЗЕ НАРАДЖАЛЬНЫ «БУМ»?

(Заканчэнне. Пачатак у нумары за 14 лютага.)

Карэспандэнт «Звязды» гутарыць з галоўным навуковым супрацоўнікам Інстытута эканомікі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, дактарам сацыялагічных навук, прафесарам Людмілай Пятроўнай ШАХОЦЬКА, маці дваіх дзяцей і бабуляй 6-гадовай унучкі.

На матэрыяльную дапамогу маладым сем'ям у Людмілы Шахоцькі такі погляд:

— Дапамагаць сем'ям трэба толькі ў самы цяжкі перыяд, а ў далейшым больш эфектыўнай дапамогай дзяржавы з'яўляюцца льготы, якія павялічваюцца прапарцыянальна павелічэнню зарплаты. Толькі пры высокім узроўні даходаў можна палепшыць матэрыяльнае становішча сям'і. І дзяржава павінна зябяспечваць такі ўзровень зарплаты, які дазволіць сем'ям мець столькі дзяцей, колькі яны хочуць.

Паводле прагнозаў Людмілы Шахоцькі, нават прыняцце праграмы імгненна не пазбавіць краіну ад дэпапуляцыі. І справа не ў тым, што праграма дрэнная — проста такіх мераў, якія б дазволілі ў самы бліжэйшы час вырашыць усе дэмаграфічныя праблемы, не існуе — больш таго, праект яе распрацоўваўся вельмі доўга і дасканала, ні адной іншай праграме, відаць, не было ўдзелена столькі ўвагі. Нягледзячы на тое, што кардынальнага пазбаўлення ад дэпапуляцыі не адбудзецца, праграму неабходна прыняць, каб стабілізаваць сітуацыю, і прамаруджанне тут пагражае яшчэ большымі праблемамі, нерэальна высокімі паказчыкамі, якіх трэба будзе дабівацца.

Што канкрэтна зменіцца пасля прыняцця Нацыянальнай праграмы дэмаграфічнай бяспекі?

— Відавочна, павялічыцца нараджальнасць, людзі перастануць адмаўляцца хоць бы ад жаданых дзяцей (а ўлічваючы, што такіх працэнтаў 30, гэта ўжо добра), палепшыцца аснашчанасць медыцынскіх устаноў, будзе ўзмоцнены прафілактычны напрамак медыцыны (што панізіць захворванне і смяротнасць) і будзе зроблены сур'ёзны ўплыў на змяненне ладу жыцця. Плануецца павелічэнне міграцыі да 5 тысяч людзей за год, пачынаючы з 2008-га.

Без імігрантаў не абысціся

Міграцыйныя працэсы былі і застаюцца вельмі складанымі, яны прыносяць карысць і маюць сур'ёзныя мінусы. Заахвоціць імігрантаў будзе нялёгка, хоць дагэтуль Беларусь з'яўляецца адзінай на постсавецкай прасторы краінай, у якую прыбывае больш насельніцтва, чым выязджае адсюль. На жаль, патэнцыял гэты на сёння вычарпаны.

— Усе, хто хацелі, ужо прыехалі, — мяркуе Людміла Пятроўна. — У асноўным вярталіся тыя, хто выехаў з Беларусі ў адну з савецкіх дзяржаў. Вярталіся з-за складанай ваенна-палітычнай абстаноўкі, нізкага ўзроўню жыцця ў іншых краінах і г.д. Зараз жа эканамічнае становішча выраўноўваецца, а палітычныя рэжымы становяцца больш лаяльнымі да рускамоўных.

Сёння нам проста неабходна стымуляваць прыток імігрантаў, пажадана рускамоўных — ім будзе прасцей інтэгравацца ў наша грамадства. Цікава, што ў праекце праграмы дэмаграфічнай бяспекі зафіксаваны меры, прызваныя стымуляваць вяртанне эмігрантаў, якія выехалі за мяжу працаваць. Відавочна, што зрабіць гэта будзе, мякка кажучы, нялёгка.

— За кошт імігрmaцыі наша сітуацыя палепшыцца, аднак і гэта не панацэя. Пачынаючы з 2000 года, насельніцтва памірае з хуткасцю 50 тысяч чалавек за год. Арыентуючыся на гэту лічбу, мы ўмоўна правялі падлікі з аналагічнай колькасцю імігрантаў. Нейтралізацыі не атрымалася: нараджаюць яны таксама няшмат, а паміраюць абсалютна так, і мы зноў маем звужанае ўзнаўленне. Пры гэтым сур'ёзна змяняецца структура насельніцтва: ужо ў сярэдзіне стагоддзя патомкамі жыхароў Беларусі будуць толькі дзве трэці насельніцтва, а ў канцы стагоддзя іх стане яшчэ на трэць менш. Аднак нават нягледзячы на гэта ні ў якім разе нельга абмяжоўваць прыток імігрантаў — без гэтага нам ніяк не абысціся: пры нязменнасці існуючых паказчыкаў нараджальнасці і смяротнасці і нулявой міграцыі, ужо да сярэдзіны стагоддзя насельніцтва Беларусі будзе складаць прыблізна 6 мільёнаў, тэмпы скарачэння насельніцтва будуць нарастаць, так што да канца стагоддзя гэты паказчык можа быць (нават страшна называць такую лічбу) менш чым тры мільёны чалавек.

Таму заахвочванне імігрантаў — мера апраўданая ды і натуральная: з рухам насельніцтва паміж краінамі распаўсюджваецца прагрэс, адбываецца абмен вопытам, навыкамі. Дзякуючы імігрантам запаўняюцца тыя нішы на рынку працы, якія мясцовае насельніцтва пакідае пустымі.

— У свой час вельмі актыўна скарыстоўвала іміграцыйныя працэсы Францыя, — зазначае Людміла Пятроўна, — чым істотна палепшыла сваю дэмаграфічную сітуацыю, аднак міжнацыянальных канфліктаў, як бачым, пазбегнуць не ўдалося.

Паводле слоў Людмілы Шахоцькі міжнародны вопыт быў шырока скарыстаны пры складанні беларускай праграмы нацыянальнай бяспекі, у прыватнасці, вопыт Францыі — краіны, якая першай пачала праводзіць актыўную дэмаграфічную палітыку, у асноўным у накірунку павышэння нараджальнасці. Безумоўна, хацелася б дасягнуць японскай працягласці жыцця і французскай нараджальнасці, аднак краінам з рознымі традыцыямі, укладам жыцця і менталітэтам, нельга цалкам пераймать нешта адна ў адной. На сёння няма краіны, якая б здолела правесці такую дэмаграфічную палітыку, што змяніла б сітуацыю да ідэальнай.

Людміла Пятроўна слушна заўважае, што ў нашым грамадстве няма адпаведнай глебы для стварэння шматдзетнай сям'і:

— Куды ні кінь — паўсюль абмежаванні для вялікай сям'і, нават у аўтамабілі на дзіцячых сядзеннях памесцяцца толькі двое малых, трэцяга ўжо не пасадзіш.

Пафаснымі лозунгамі пра сям'ю — ячэйку грамадства прэстыж яе не падняць, трэба мяняць установкі на ўзроўні выхавання, фарміравання грамадскай думкі: ніякія кар'ерныя поспехі не заменяць цікавай гавані і трывалай крэпасці адначасова — моцнай, надзейнай, удалай сям'і.

Ала МАЧАЛАВА.

ЭХ, ПРАКАЧУ!

На развіццё коннага спорту ў цэнтральным рэгіёне летась выдзелена больш чым 3,6 мільярда рублёў

ЗЯМЛЯ І ЛЮДЗІ МІНШЧЫНЫ

Яшчэ гадоў пятнаццаць таму на Міншчыне было 16 конна-спартыўных школ, дзе працавалі вопытныя трэнеры. І спартсмены дабіваліся добрых паказчыкаў. Аднак становішча пэўным чынам змянілася, і пра поспехі ў конным спорце пачалі «забываць», а моцная база паступова прыходзіла ў заняпад. Як адзначаюць ва ўпраўленні фізічнай культуры, спорту і турызму Мінскага аблвыканкама, «у спадчыну» засталіся і некаторыя негатыўныя моманты — дэфіцыт спецыялістаў, недахоп спартыўных коней, нізкі ўзровень матэрыяльна-тэхнічнай аснашчанасці.

Таму ў цэнтральным рэгіёне вырашылі адрадзіць былую славу і актыўна заняліся гэтай справай. Напрыканцы 2005 года была створана спецыялізаваная абласная дзіцяча-юнацкая школа з аддзяленнямі ў Мінскім, Лагойскім і Уздзенскім раёнах, а таксама ў Барысаве. Аб сур'ёзнасці намераў сведчыць, напрыклад, тое, што летась на развіццё коннага спорту з абласнога бюджэту было выдзелена 3,65 мільярда рублёў. Плануецца ўзвядзенне конна-спартыўных комплексаў у Барысаве, Клецку і Старобіне. Сёлета мяркуюць увесці ў эксплуатацыю першую чаргу адной з самых маштабных будоўляў вобласці — конна-спартыўнага комплексу «Ураджайны». Тут узвядуць разміначны манеж, канюшню і адміністрацыйны корпус.

У сельскагаспадарчым вытворчым кааператыве «Палачаны», што ў Маладзечанскім раёне, вырашана стварыць абласны Цэнтр па падрыхтоўцы рэзерву па коннаму спорту і вырошчванню спартыўных коней. Летась тут правялі грунтоўную рэканструкцыю — зрабілі канкурнае поле, трыбуну, судзейскую, адрамантавалі гасцініцу, пафарбавалі манеж. На правядзенне гэтых работ выдаткавана каля 1,3 мільярда рублёў. Цяпер у Палачанах можна прымаць спаборніцтвы самага высокага ўзроўню. Тут рэгулярна праходзяць абласныя мерапрыемствы, а сёлета ў жніўні плануецца правесці этап Кубка свету па коннаму спорту. Справа для гаспадаркі не ў навінку — развіваць адпаведны напрамак тут пачалі больш чым 20 гадоў таму.

— Гаспадарка ў савецкія часы стала адной з першых у гэтых мясцінах мільянерам, — узгадвае намеснік старшыні СВК «Палачаны» Ніна Станевіч, — таму магла сабе многае дазволіць. У свой час шэсць коней купілі для таго, каб мясцовай дзятве ездзіць. Пасля паціху пачалі «раскручваць» справу, і зараз гэта — сапраўдная візітоўка гаспадаркі.

«Палачаны» па-ранейшаму з'яўляюцца аднымі з лідараў сельгасвытворчасці ў Маладзечанскім раёне. Не так даўно да іх далучылі стратнае аграпрамысловае прадпрыемства, так што палеткі СВК пачынаюцца амаль адразу за горадам. Тэрыторыя аб'яднанай гаспадаркі зараз складае 4,5 тысячы гектараў. У «Палачанах» зараз працуюць 360 чалавек. Ёсць сярод іх і ветэраны, якія, нягледзячы на ўзрост, могуць «даць форы» многім маладым. Адзін з іх — Іван Кавалеўскі. Яму 75 гадоў, але Іван Іосіфавіч дасюль працуе ў гаспадарцы механізатарам. Г

Ці будзе адменена кампенсацыя за імянныя прыватызацыйныя чэкі?

У Палаце прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі знаходзіцца на разглядзе законапраект «Аб імянных прыватызацыйных чэках Рэспублікі Беларусь». Дакумент прадугледжвае, што па заканчэнні тэрміну звароту імянных прыватызацыйных чэкаў за нявыкарыстаныя ўладальнікамі чэкі кампенсацыя выплачвацца не будзе.

Да імянных прыватызацыйных чэкаў адносяцца чэкі «Маёмасць» і «Жыллё». Цяперашні варыянт закона прадугледжвае пагашэнне нявыкарыстаных чэкаў пасля канчатковага тэрміну іх звароту з выплатай кампенсацыі. Для чэкаў «Жыллё» тэрмін звароту не ўстаноўлены, а тыя з іх, што не былі да пачатку года перарэгістраваныя, прызнаюцца несапраўднымі. Тэрмін звароту чэкаў «Маёмасць» устаноўлены па 30 чэрвеня 2007 года, праўда, яго можна прадоўжыць, што ўжо і рабілася неаднаразова.

У адпаведнасці з законапраектам, які цяпер знаходзіцца ў Палаце прадстаўнікоў, адмена выплаты кампенсацыі не пацягне заканчэнне тэрмінаў звароту прыватызацыйных чэкаў. Тыя грамадзяне, якія не выкарысталі іх, не будуць пазбаўляцца правоў на частку прыватызуемай маёмасці дзяржаўных прадпрыемстваў або правоў на прыватызацыю дзяржаўнага жыллёвага фонду. У той жа час аб тэрмінах у законапраекце гаворыцца. Так, для прадастаўлення грамадзянам дадатковага часу на рэалізацыю свайго права на атрыманне часткі дзяржаўнай маёмасці прапануецца норма аб тым, што Савет Міністраў не можа ўстанавіць тэрмін звароту чэкаў «Маёмасць» меншы, чым па 31 снежня 2009 года, г. зн. на тэрмін не меншы за тры гады.

Як паведаміў намеснік міністра эканомікі Алег Мельнікаў, правам на атрыманне ў якасці асабістай маёмаснай квоты чэкаў «Маёмасць» валодалі крыху больш за 7,8 млн грамадзян Беларусі, аднак фактычна іх атрымалі 4,9 млн грамадзян. Прычым дастаткова значная іх частка выкарыстала чэкі не па прамому прызначэнню. Увядзенне нормы аб тэрміну звароту чэкаў, лічыць А. Мельнікаў, павінна стымуляваць грамадзян да выкарыстання свайго права. Што ж датычыцца нормы аб адмене кампенсацыі за нявыкарыстаныя чэкі «Маёмасць», то, паводле слоў А. Мельнікава, гэта будзе складана зрабіць эканамічна. У прыватнасці, бюджэтныя выплаты маглі б скласці больш за 821 млрд рублёў, што можна параўнаць з мінулагоднімі расходамі рэспубліканскага бюджэту на ахову здароўя ці адукацыю. Выплата ж кампенсацыі па чэках «Жыллё» не зусім актуальна, бо практычна ўсе яны будуць выкарыстаны па прамому мэтаваму прызначэнню. Акрамя таго намеснік міністра эканомікі адзначыў, што тэрміны звароту чэкаў можна ў любы момант прадоўжыць.

Са свайго боку намеснік парламенцкай камісіі па жыллёвай палітыцы, будаўніцтву, гандлю і прыватызацыі Галіна Палянская адзначыла, што абмяжоўваць тэрмін звароту чэкаў «Жыллё» нават і «не менш за тры» гады нельга, бо ўсе грамадзяне, якія іх маюць, усё роўна не змогуць скарыстаць іх па прамому прызначэнню. Так, у адпаведнасці з прэзідэнцкім дэкрэтам, чэкі «Жыллё» можна выкарыстоўваць не толькі на прыватызацыю дзяржаўнага жыллёвага фонду, але і грамадзянамі, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў і стаяць на адпаведным уліку, на будаўніцтва (рэканструкцыю) і пакупку такімі грамадзянамі жылых памяшканняў, пагашэнне крэдытаў, што былі ўзяты і выкарыстаны на гэтыя мэты. І нарэшце ці нават самы вялікі аптыміст лічыць, што ўсе грамадзяне, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, атрымаюць жыллё ў запланаваныя тры ці больш гады. Намеснік гэтай жа парламенцкай камісіі Ганна Бурава адносна абмену чэкаў «Маёмасць» лічыць, што насельніцтва амаль не выказвае жадання выкарыстаць свае чэкі таму, што прадпрыемствы, акцыі якіх прапануюцца, далёка не самыя перспектыўныя.

Законапраект, які прадугледжвае адмену кампенсацыі за нявыкарыстаныя імянныя прыватызацыйныя чэкі, паступае ў парламент не ўпершыню. У 2003 годзе ён быў адхілены дэпутатамі, у 2004 — адазваны распрацоўшчыкамі на дапрацоўку. На гэты раз сітуацыя таксама не адназначная: асобныя камісіі прапануюць адхіліць законапраект, другія — прапісаць палажэнне, якое б дадаткова не абмяжоўвала тэрмін звароту чэкаў «Жыллё» ўпамінаемым у законапраекце тэрмінам «не менш за тры гады».

Сяргей КАРАЛЕВІЧ.

Свая справа

ДАЦКІ ВЕКТАР ляхавіцкіх бізнэсменаў

У бізнэсе ёсць свае законы, якія нельга ігнараваць. Напрыклад, нават самы дзелавы чалавек сутыкнецца з вялікімі праблемамі, калі не здолее абысці канкурэнтаў ці не знойдзе месца збыту сваёй прадукцыі. І зусім іншая справа, калі тых канкурэнтаў няма, а праблема найперш адна — як расшырыць вытворчасць. Але і ў такім выпадку не варта расслабляцца — справа застою не любіць.

Усё здарылася, можна сказаць, выпадкова — са знаёмства з бізнэсменам з Даніі, які прыехаў да нас, каб заказаць некалькі драўляных домікаў для сезоннага пражывання. Іх у Даніі ставяць для адпачываючых на беразе мора. Буйное прадпрыемства за дробны заказ не ўзялося, а індывідуальны прадпрымальнік Аляксей Бацанаў з Ляхавіч уцяміў, што шанц нельга ўпусціць і прапанаваў датчаніну свае паслугі.

Але аднаму стварыць фірму было цяжка -- патрэбен стартавы капітал. Грошы знайшліся, калі заснавальнікамі ТАА «Ляхавічыдрэў», акрамя Бацанава, выступілі мясцовы прадпрымальнік В. Панфіла і жыхар райцэнтра В. Драздовіч.

Вось так і ўзнікла прадпрыемства па вытворчасці драўляных каркасных дамоў. Безумоўна, напачатку было складана, бо заказчык патрабаваў якасці, і нашым рабочым давялося мяняць усталяваныя падыходы да працы. Дэталі дамоў вырабляюцца ў нас, а затым на «фурах» транспартуюцца ў Данію. Сёння ёсць магчымасць вырабляць не толькі домікі-кемпінгі, але і жылыя, у якіх можна жыць круглы год.

За паўтара года існавання прадпрыемства адправіла заказчыку шэсць дамоў, але Аляксей Бацанаў, які з'яўляецца дырэктарам ТАА «Ляхавічыдрэў», лічыць, што гэтага мала. На яго думку, неабходна вырабляць 4—6 дамоў у месяц.

Патрэбна расшырацца, тым больш што паступіў заказ і з Украіны — туды паставілі два дамы.

Праўда, усе гэтыя домікі-цацкі, не для нашага чалавека. З якога боку ні паглядзіш, але 21 тыс. еўра — гэта многа. За такія грошы можна пабудаваць капітальны дом, які ўсё ж будзе мець больш салідны выгляд. Але справа не ў гэтым, галоўнае, што прадукцыя запатрабаваная. Ды не толькі дамы, але і нашы вокны сотнямі адпраўляюцца ў Данію, як бачым, ёсць там попыт і на іх.

А калі вярнуцца да пачатку нашай размовы, то канкурэнтаў у ТАА «Ляхавічыдрэў» няма. Ва ўсякім разе, на Брэстчыне такая фірма адзіная і гэты факт вельмі важны.

Летась на прадпрыемстве было адкрыта 30 новых рабочых месцаў. Але не трэба забываць, што раённы цэнтр занятасці выдзеліў на гэта 180 млн рублёў. І сёння ў калектыве — 50 чалавек. Зарплата тут прывязаная да эфектыўнасці працы і, са слоў А. Бацанава, складае 400—700 тыс. у месяц, а рэнтабельнасць на прадпрыемстве — 22 працэнты.

Безумоўна, вытворчасць патрэбна расшыраць, але ёсць аб'ектыўныя прычыны, якія не даюць магчымасці гэта зрабіць. Напрыклад, узніклі пэўныя цяжкасці са спецыялістамі. Знайсці высакакваліфікаванага сталяра ўжо няпроста. Далёка не ўсе работнікі адпавядаюць патрабаванням вытворчасці. Дырэктар фірмы сказаў, што можна поўнасцю даверыць, як спецыялістам, чалавекам пятнаццаці, а астатніх неабходна кантраляваць. Гэта абумоўлена і тым, што Ляхавічы — невялікі райцэнтр, і выбар спецыялістаў тут абмежаваны. І зноў жа, расшырэнне — гэта не толькі новыя рабочыя месцы, але і новыя вытворчыя плошчы, абсталяванне, і на ўсё патрэбныя грошы.

А іншых перашкод быццам бы і няма. Бацанаў заявіў, што сёння, хоць і цяжка даводзіцца, але працаваць можна. На пачатку станаўлення прадпрыемства было шмат праверак, а цяпер сітуацыя змянілася да лепшага.

А якія адносіны паміж заснавальнікамі? Калі ў фірмы адзін гаспадар, то ўсё зразумела, а тут трое.

— Пакуль усё нармальна. Дзяліць яшчэ асабліва няма чаго, бо фірма толькі становіцца на ногі. Сваім кампаньёнам я давяраю, — сказаў А. Бацанаў.

Адмаўляць той факт, што заказчыкі аказаліся прыстойнымі партнёрамі, нельга. Датчане падказалі ідэю, зрабілі прапанову, прывезлі спецыялістаў і не даймалі прыдзіркамі. Але калі б ляхавіцкія прадпрымальнікі не праявілі ініцыятыву, то пра фірму і гаворкі не было б. Яны не ўпусцілі свой шанц.

У нас укаранілася думка, што заходні рынак даўным-даўно размеркаваны і там свабодных нішаў ужо няма. Сітуацыя з ТАА «Ляхавічыдрэў» дае падставы меркаваць, што гэта не зусім так. Рынак — рэч рухомая і непрадказальная і калі ты можаш прапанаваць канкурэнтаздольную прадукцыю — пакупнік знойдзецца. І не варта казаць, што час ініцыятыўных людзей скончыўся і «на кані» аказаўся той, хто не разгубіўся — гэтае правіла дзейнічае ў любы час і ў любой сітуацыі.

Сымон СВІСТУНОВІЧ,
Ляхавіцкі раён.

Сёння

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	7.31	17.18	9.47
Віцебск —	7.23	17.04	9.41
Магілёў —	7.21	17.08	9.47
Гомель —	7.13	17.08	9.55
Гродна —	7.45	17.34	9.49
Брэст —	7.42	17.38	9.56

Месяц

Маладзік 17 лютага
Месяц у сузор'і Вадалея

Імяніны

Пр. *ГРАМНІЦЫ (СТРЭЧАННЕ ГАСПОДНЯЕ)*
К. *Агаты, Геаргіны, Арнольда, Зігфрыда, Юзафа*

Надвор'е на заўтра



Няма прыкметных геамагнітных узрушэнняў

...у суседзяў

ВАРШАВА	-3 — -1 °С	МАСКВА	-13 — -11 °С
ВІЛЬНЮС	-8 — -6 °С	РЫГА	-6 — -4 °С
КІЕЎ	-6 — -4 °С	С-ПЕЦЯРБУРГ	-9 — -7 °С

Без ападкаў

36'6° ГРЫП ЗАПРАШЭННЯ НЕ ПРОСІЦЬ

Сталічныя паліклінікі фіксуюць рост колькасці выпадкаў вострых рэспіраторных вірусных інфекцый і грыпу сярод дзяцей і дарослых

Практычна ўсе дзіцячыя паліклінікі яшчэ ў студзені праводзілі ў паліклініках і школах дні профілактыкі гэтых захворванняў, раздавалі памяткі аб тым, як засцерагчыся ад сезонных непрыемнасцяў. На жаль, часта веды застаюцца ведамі. Паводле слоў урача-валеолага 17-й гарадской дзіцячай клінічнай паліклінікі г. Мінска Інэсы ПАЛАЗНІК, апытанні, якія праводзяцца сярод бацькоў і дзяцей паказваюць, што на практыцы рэкамендацыі не вытрымліваюцца. Прымусіць некага клапаціцца пра сваё здароўе не здольныя ні медыкі, ні журналісты. Тым не менш, і адны, і другія будуць працягваць асветніцкую работу.

Фота Пятра ФАМІНА.

Гэткі непастаянны

Грып — гэта вострае інфекцыйнае захворванне, пры якім асноўны ўдар прыпадае на слізістую дыхальных шляхоў і якое суправаджаецца працэсам інтаксікацыі. Існуюць тры тыпы вірусаў грыпу — А, В і С. Найлягчэй чалавек пераносіць тыпы В і С. Ад многіх іншых вірусаў вірус грыпу адрозніваецца сваёй зменлівасцю. Невялікія змяненні здараюцца з ім штогод, з-за чаго і ўзнікаюць эпідэміі.

Выбар ахвяры

Вірусныя часціцы пераносяцца ад хворага чалавека да здаровага падчас кашлю, чхання ці нават размовы — паветраным шляхам. Сліна ўтрымлівае вялікую колькасць бактэрый, так што на нейкі час вакол хворага ўтвараецца зона заражэння радыусам 2—3 метры. Акрамя гэтага, хворы пакідае бактэрыі на ўсіх прадметах, якімі карыстаецца — рушніку, посудзе і г.д. Размнажэнне вірусаў адбываецца з неверагоднай хуткасцю. Інкубацыйны перыяд, калі з'яўляюцца прыкметы захворвання, складае пры грыпе літаральна 1—2 сутак. Чалавек становіцца «небяспечным» для навакольных напрыканцы інкубацыйнага перыяду, а праз 1—2 дні дасягаецца максімум заразлівасці. Праз 5—7 дзён канцэнтрацыя віруса ў павет-ры, якое выдыхае хворы, рэзка зніжаецца, і ён становіцца практычна бяспечным.

Анфас і ў профіль

Вы дакладна захварэлі на грып, калі адчуваеце дрыжыкі, павышаную тэмпературу, слабасць, боязь святла, сустаўны, мышачны і галаўны боль, боль у горле, кашаль, насмарк. Калі грып — без ускладненняў, то востры перыяд хваробы працягваецца 3—5 дзён і канчатковае выздараўленне надыходзіць на працягу 5—10 дзён. Аднак пасля грыпу часта ўзнікае паўторнае інфіцыраванне бактэрыямі або іншымі вірусамі. Пасля перанесенага грыпу на працягу 2—3 тыдняў могуць назірацца стомленасць, слабасць, галаўны боль, раздражнёнасць, бяссонніца.

Вельмі небяспечны

Асноўная небяспека грыпу хаваецца ў рызыцы развіцця постгрыпозных ускладненняў, да ліку якіх найперш адносяцца пнеўманія, рыніт, сінусіт, бранхіт, атыт, ускладненні з боку сардэчна-сасудзістай сістэмы, мышачныя ўскладненні, абвастрэнні хранічных хвароб. Грып можа прывесці да смяротнага зыходу, што тлумачыцца інтаксікацыяй, надыходам, напрыклад, кровазліцця ў галаўны мозг, сардэчнай ці сардэчна-лёгачнай недастатковасці.

Можна «ўцалець»

Вядома, што «групам рызыкі» — дзецям, сталым людзям і г.д. з мэтай прафілактыкі цяжкіх наступстваў грыпу лепей за ўсё прышчапіцца. Бясплатна і ў любой паліклініцы. Астатнім ахвотнікам — за плату, паводле папярэдняга званка па 003. Прышчэпкі не гарантуюць стопрацэнтнай абароненасці ад грыпу, аднак нават калі чалавек захварэе, то перанясе захворванне значна лягчэй. Цяпер, зразумела, прышчэплівацца позна. Застаюцца іншыя меры.

Па-першае, загартоўванне арганізма — вільготныя абціранні, абліванні рук і ног халоднай вадой, кантрастны душ (памятайце, што вільготнае загартоўванне больш эфектыўнае, чым паветранае), збалансаванае, дробнае харчаванне, правільны рэжым працы і адпачынку.

Па-другое, для павышэння агульнай устойлівасці арганізма можна прымяняць настойкі і экстракты жэньшэню, элеутэракоку, шыпшыны, ужываць мёд, цыбулю, часнок і г.д.

Па-трэцяе, фізічная актыўнасць.

Па-чацвёртае, апранацца па надвор'ю — не перагравацца, не хадзіць без галаўнога ўбору і ў лёгкім абутку.

Па-пятае, пазбягаць шматлюдных месцаў.

Па-шостае, перад выхадам на вуліцу змазваць насавыя пазухі аксалінавай маззю.

Па-сёмае, пастаянна праветрываць памяшканні.

Пры першых сімптомах грыпу трэба тэрмінова звярнацца да ўрача і не займацца самалячэннем.

Святлана БАРЫСЕНКА.

Ці далёка да Аніскіна сельскім участковым з брэсцкай глыбінкі?

Якім павінен быць сёння ўчастковы інспектар міліцыі? Дзе яму належыць жыць? Ці важна, каб насельніцтва, асабліва вясковыя жыхары, ведалі ў твар свайго ўчастковага? Пытанні, здаецца, простыя, але адназначнага адказу на іх пакуль няма, як вынікае з пашыранай аператыўнай нарады ўпраўлення ўнутраных спраў аблвыканкама. Начальнік абласнога УУС Віктар Краснічэнка знарок пабудаваў свой даклад на аналізе негатыўных фактаў. І прысутным у зале ўчастковым, а таксама іх начальнікам рабілася, мякка кажучы, няёмка, калі расказвалі пра іх. Напрыклад, такое: у Жамчужным Баранавіцкага раёна ваколіцы апорнага пункта моладзь выбрала месцам «тусоўкі» і ўтварыла амаль што сметнік.

Як гаварылі людзі з экрана відэафільма, які паказалі ўдзельнікам нарады, у Пачапава Баранавіцкага раёна часцей бачаць начальніка раённай міліцыі, чым участковага. А абстаноўка з самагонкай ды сурагатнымі напоямі там больш чым складаная. Літаральна за паўтара тыдня ад атручэння сурагатамі памерла тры чалавекі і некалькі трапіла ў бальніцу. Участковы там адзін на два сельсаветы, да таго ж у яго няма транспарту. І гэта, відаць, лічыцца апраўданнем, што не бачаць яго людзі тыднямі, а то і болей.

Адзін з іх, усё з таго ж Баранавіцкага раёна, парушыў службовую тайну і зрабіў набыткам усёй вёскі прозвішча жанчыны, якая паведаміла ў міліцыю пра самагоншчыкаў і гандляроў сурагатамі. Кабета перш за ўсё хацела абараніць мужа ад спакусы купіць атруту на вядомых усім «кропках», але стала прадметам асуджэння, хай і не лепшай часткі аднавяскоўцаў. Другі яго калега з суседняга Івацэвіцкага раёна «завалакіціў» заяву пенсіянеркі аб тым, што на яе напала зграя сабак канкрэтнага гаспадара. Калі ў абласным упраўленні праводзілі службовую праверку па названых фактах, выпадкова высветлілася, што ў аднаго з гэтых міліцыянераў цешча — самагоншчыца. Як кажуць, і смех, і грэх.

Зусім кепскім было названа становішча ў Столінскім раёне, дзе паводле сацыялагічнага апытання, 72 працэнты вясковых жыхароў не ведаюць свайго прадстаўніка міліцыі. Старшыня аблвыканкама Канстанцін Сумар, які прысутнічаў на нарадзе, лічыць, што сельскі ўчастковы павінен жыць у вёсцы, там, дзе працуе, а не быць прыезджым прадстаўніком. У Кобрынскім раёне, напрыклад, толькі двое з 20 інспектараў жывуць на сваіх участках. Але гэта, хутчэй, выключэнне, чым правіла. Выканаўчая ўлада спрыяе вырашэнню пытання з жыллём для участковых. Так, летась гэтай катэгорыі працаўнікоў было выдзелена 20 службовых кватэр, у папярэднія гады — па шэсць — восем.

Старшыня аблвыканкама паставіў задачу разабрацца з усім процізаконным абаротам спіртных напояў у вёсках на працягу гэтага года. Паводле паведамлення Канстанціна Сумара, у нас ёсць усе магчымасці, каб справіцца з гэтым злом нават за паўгода.

Армія ўчастковых Брэстчыны складае 547 чалавек, 312 з іх працуюць у вёсках. Летась сіламі ўчастковых раскрыта 1691 злачынства — кожнае пятае з раскрытых. А вось умовамі для работы пахваліцца не кожны службовы ўчастка. Некаторыя нават не маюць сваіх кабінетаў у сельвыканкаме і прымаюць грамадзян дзе прыйдзецца, службовымі аўтамабілямі забяспечаны менш за трэць інспектараў, тэлефоны маюць 70 працэнтаў. Таму лагічным выглядала ўручэнне прама на нарадзе пяці лепшым участковым вобласці ключоў ад новых службовых аўтамабіляў.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

Спорт-тайм

КУБАК ФЕДЭРАЦЫІ РАЗЫГРАЮЦЬ У ЧАТЫРОХ ГАРАДАХ

Стаў вядомы састаў груп Кубка федэрацыі (турнір быў арганізаваны беларускай федэрацыяй футбола, каб каманды мелі больш гульнявой практыкі перад чэмпіянатам краіны). Матчы пройдуць на палях са штучным пакрыццём з 12 па 25 сакавіка ў чатырох гарадах. У Віцебску згуляе квартэт «А» — барысаўскі БАТЭ, «Віцебск», магілёўскі «Днепр» і «Гомель». У сталіцы сіламі памераюцца прадстаўнікі групы «Б»: мінскае «Дынама», жданавіцкая «Дарыда», жодзінскае «Тарпеда» і ФК «Мінск». У Гродне сустрэнуцца каманды квартэта «В» — сталічныя МТЗ-РІПА і «Лакаматыў», гродзенскі «Нёман» і «Смаргонь». У Пінску змагацца за кубак будзе група «Г» — салігорскі «Шахцёр», наваполацкі «Нафтан», брэсцкае «Дынама» і пінская «Хваля».

«ДРАКОНЫ» Ў РАСІІ ГУЛЯЦЬ НЕ БУДУЦЬ

Старшыня федэрацыі хакея Беларусі Уладзімір Навумаў паведаміў, што прадстаўляць нашу краіну ў вышэйшай лізе расійскага чэмпіянату будзе аб'яднаная каманда, якую створаць толькі два мінскія клубы — «Юнацтва» і «Дынама» (раней у новую дружыну таксама павінны былі ўвайсці і хакеісты мінскага «Кераміна», але акцыянеры і кіраўніцтва «драконаў» адмовіліся ад гэтага праекта). На гэтым тыдні праходзяць перамовы паміж камандамі. Таксама ўдакладняецца назва прадстаўніка Беларусі ў Расіі. Магчыма, гэта будуць «Мінскія зубры».

Шаноўная **Таццяна Паўлаўна БАТУРА**, *у дзень нараджэння зычым кахання, дабра, цяпла і радасці. Не схіляйся рабінай нават цяжка калі, Будзь заўсёды шчаслівай і не ведай бяды.*
Калектыў карэліцкай газеты «Полымя».

15 лютага

Дзве даты



1564 год — нарадзіўся Галілео Галілей, італьянскі фізік, матэматык, астраном. Змагаўся супраць схаластыкі, лічыў асновай пазнання вопыт, заклаў асновы навуковай механікі, актыўна абараняў геліяцэнтрычную сістэму свету, за што быў падвергнуты суду інквізіцыі. Да канца свайго жыцця Галілей лічыўся «вязнем інквізіцыі», таму вымушаны быў жыць у ссылцы. У 1992 годзе папа Ян Павел II аб'явіў рашэнне суда інквізіцыі памылковым і рэабілітаваў Галілея.

1522 год — у Вільні ў доме Якуба Бабіча стала працаваць беларуская друкарня, заснаваная Францішкам Скарынай. У ёй выдадзены кнігі «Апостал» і «Малая падарожная кніжыца».

Цытата дня

«Хіба можна сказаць, што чалавек цясляр ці музыкант, калі бачыш у ягоных руках сякеру ці гуслі? Так жа нельга назваць чалавека мудрым, калі ён толькі гаворыць мудрыя словы».

Эпіктэт (50—140), старажытнагрэчаскі філосаф-стоік.

Усміхнёмся!

Злавілі туземцы турыста. Збіраюцца есці, на ражон павесілі і пытаюцца:

— Цябе як завуць?

— А вам якая розніца? Усё роўна ж з'ясце!

— З'есці з'ядзім, а што ў меню пісаць?

☺

Сустракаюцца двое.

— Вы не ведаеце, дзе Дэрыбасаўская?

— Хто — я не ведаю?! Гэта вы не ведаеце!

☺

Мы тут пяць хвілін працавалі-працавалі, працавалі-працавалі. Потым хуценька гадзінку адпачылі, а вось пасля зноў пяць хвілін як папрацавалі-папрацавалі...

☺

Купілі 4 кілаграмы мяса на шашлык, пакінулі размарожвацца і пайшлі за півам. Пакуль хадзілі (гадзіны 2—3), мяса не стала — кот з'еў. Пашалелі-пазлавалі, але нічога не зробіш. Узважылі ката — роўна 4 кілаграмы. Ва ўсіх узнікла пытанне, а дзе ж, уласна кажучы, кот?..

☺

Двое ў ложку.
Яна: — Пажэнімся?
Ён: — Сазвонімся.

ОАО «Минскторгавтотранс»

извещает о проведении очередного общего собрания акционеров Общества 22 марта 2007 г. по адресу: г. Минск, пер. Солтыса, 5, Грузовой автомобильный парк № 3, ОАО «Минскторгавтотранс».

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. Об итогах деятельности Общества за 2006 год и задачах на 2007 год.
2. Отчет о работе Наблюдательного совета в 2006 году.
3. Отчет Ревизионной комиссии о результатах проверки финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2006 год.
4. Утверждение годового отчета, бухгалтерского баланса, отчета о прибыли и убытках Общества.
5. Утверждение направлений использования чистой прибыли, полученной в 2006 году, и на 2007 год.
6. Утверждение устава акционерного общества в новой редакции.
7. О передаче Наблюдательному совету полномочий, отнесенных к компетенции собрания.
8. Утверждение условий материального вознаграждения членов наблюдательного совета и Ревизионной комиссии.
9. Избрание членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии.

При себе необходимо иметь паспорт или документ, подтверждающий полномочия на участие в собрании (доверенность, оформленную в соответствии с требованиями законодательства).

Начало собрания в 16.00. Регистрация — с 15.00.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

РАСІЯ ЗНОЎ ПАГРАЖАЕ БЕЛАРУСІ І ЛІТВЕ?

Паводле слоў Сямёна Вайнштока, кіраўніка кампаніі «Транснафта», Расія можа поўнасцю адмовіцца ад паставак нафты ў Літву і ў выпадку неабходнасці менш чым за паўтара года пабудаваць трубапровад у абход Беларусі.

Выступаючы ў аўторак у Лондане, Вайншток заявіў, што тэарэтычна аднаўленне паставак нафты ў Літву, спыненых з-за аварыі на нафтаправодзе «Дружба» ў ліпені 2006 года, магчыма ўжо да канца сакавіка. Аднак, існуе магчымасць таго, што Ростэхнагляд запатрабуе правядзення рамонтных работ, якія могуць расцягнуцца на год ці два. У такім выпадку «Транснафта» не выключае, што адмовіцца ад іх правядзення і спыніць пастаўкі нафты ў Літву трубаправодным транспартам.

Нагадаем, што пасля таго, як пастаўкі па «Дружбе» былі спынены, нафта пастаўляецца ў Літву танкерамі з расійскага Прыморска, што павышае яе кошт. Асобныя літоўскія палітыкі выказваюць меркаванне, што спыненне трубаправодных паставак нафты Расіяй было наўмысным і павінна было перашкодзіць польскай PKN Orlen набыць нафтаперапрацоўчую кампанію Mazeikiu nafta, на якую прэтэндавалі расіяне.

Сігнал Вайнштока Мінску заключаўся ў заяве аб тым, што Расія здольная «значна» павялічыць экспартныя магутнасці свайго балтыйскага нафтаналіўнога порта ў Прыморску. Паводле слоў кіраўніка «Транснафты», спатрэбіцца не больш за 18 месяцаў, каб пабудаваць нафтаправод у абход Беларусі. Ён дадаў, што рашэнне ўрада па праекту Унеча—Прыморск можа быць прынята да сярэдзіны сакавіка.

УКРАІНА АПАСАЕЦЦА АБМЕЖАВАННЯ ПАСТАВАК ГАЗУ

Прагнозы газавага дэфіцыту ў Расіі непакояць Украіну, якая апасаецца абмежавання паставак расійскага блакітнага паліва ў 2007 годзе. Украінскія энергетыкі мяркуюць, што аб'ём дэфіцыту ў 4 млрд кубаметраў газу не ўдасца ліквідаваць толькі за кошт пераводу электрастанцый на мазут і вугаль. Самым лагічным для Расіі выйсцем будзе скарачэнне найменш прыбытковага ўкраінскага экспарту.

Пра дэфіцыт газу ў Расіі ў 2007 годзе ў памеры 4 млрд кубаметраў 13 лютага заявіў кіраўнік праўлення РАТ «АЭС Расіі» Анатоль Чубайс.

МАЛДОВА СТРАЧВАЕ ДЗЯРЖАЎНАСЦЬ: ПАЛОВА ГРАМАДЗЯН КРАІНЫ ЎЖО РУМЫНЫ

Чэргі каля румынскага консульства ў малдаўскай сталіцы растуць штодня. Паводле слоў прэзідэнта Румыніі Траяна Бэсеску, зараз у пасольстве краіны ў Кішынёве сваёй чаргі чакаюць 1,5 мільёна заяў на атрыманне румынскага грамадзянства.

У лютым Міністэрства юстыцыі Румыніі распарадзілася паскорыць працэдуру выдачы нацыянальных пашпартоў малдаванам і нават падрыхтавала адпаведны законапраект. На тэрыторыі Малдовы ў гэтых мэтах адкрыта два дадатковыя консульскія аддзелы, піша «Независимая газета». Такое развіццё падзей некаторыя палітыкі ў Кішынёве і Ціраспалі называюць «паглынаннем Малдовы Румыніяй». А нацыянал-ліберальная партыя прапанавала абедзвюм дзяржавам аб'яднацца ў саюз па прыкладу Беларусь—Расія. Многія грамадскія і палітычныя дзеячы Малдовы заяўляюць аб магчымай страце краінай сваёй дзяржаўнасці.

МЕДЭКСПЕРТ НАЗВАЎ ЭСТОНІЮ РАЕМ ДЛЯ ПЕДАФІЛАЎ

Для ўтаймавання працвітаючай у Эстоніі педафіліі необходна зрабіць больш жорсткімі існуючыя законы, асабліва ў частцы адказнасці за сэксуальнае насілле. З такой заявай выступіў дырэктар эстонскага бюро Судова-медыцынскай экспертызы Юлар Ланно.

«У педафілаў у Эстоніі вельмі лёгкае жыццё», — лічыць эксперт. Згодна з яго інфармацыяй, у рэспубліцы сярод дзяцей да 14 гадоў сэксуальным дамаганням ці насіллю падвяргаліся 7 працэнтаў дзяўчынак і 4 працэнты хлопчыкаў.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, А. МЯСНІКОЎ, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287-19-19; аддзелаў: пісьмаў — 287-18-64, падпіскі і распаўсюджвання — 287-18-51, юрыдычнага — 287-19-68, сакратарыята — 292-05-82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292-44-12; «Мясцовае самакіраванне» — 292-21-03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20-37-98, Віцебску: 24-31-92, Гродне: 43-25-29, Гомелі: 74-13-92, Баранавічах: 7-26-02, Магілёве: 32-74-31; бухгалтэрыі: 292-22-03; даведкі па рэкламе і аб'явах тэл./факс: 287-17-79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс: 292-04-52.

html: www.zvyazda.minsk.by **E-mail:** info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя пакідае за сабой права не ўступаць у перапіску з аўтарамі. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 37.095. Індэкс 63850. Зак. № 899. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

У суд Фрунзенскага раёна г. Мінска паступіла заява аб прызнанні адсутнай без вестак **СІТКЕВІЧ Наталлі Уладзіміраўны**, 24 студзеня 1974 года нараджэння, ураджэнкі г. Віцебска, якая пражывала да 2 кастрычніка 2003 года ў г. Мінску па вул. Берута, 6-1-193. Просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць звесткі пра Н.У. Сіткевіч, паведаміць іх суду Фрунзенскага раёна г. Мінска на адрас: 220092 г. Мінск, вул. Д.-Марцінкевіча, 1-2-132 на працягу двух месяцаў з дня апублікавання аб'явы.

У суд Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці паступіла заява аб аб'яўленні памерлым **ШЛЕНСКАГА Валерыя Аляксандравіча**, 6 студзеня 1963 года нараджэння, ураджэнца г. Кобрына, які ў лютым 2003 года выехаў у Расійскую Федэрацыю. Просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць звесткі пра В.А. Шленскага, паведаміць іх суду Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці на працягу двух месяцаў з дня апублікавання аб'явы.

КАЛЕКТЫЎ «САЛІГОРСКПРАМБУДА» ПЕРАСЯГНУЎ 200-МІЛЬЯРДНЫ РУБЕЖ БУДАЎНІЧА-МАНТАЖНЫХ РАБОТ ПА ГЕНПАДРАДУ

Аглядальнік «Звязды» гутарыць з генеральным дырэктарам ААТ «Салігорскпрамбуд» Мікалаем АШЭЙЧЫКАМ

1. Вынікі года радуюць

— Паважаны Мікалай Захаравіч. Як вядома, усё пазнаецца ў параўнанні. У недалёкім 2005 годзе «Салігорскпрамбуд» выканаў работ па генпадраду на 187 мільярдаў, а ўласнымі сіламі — на 140 мільярдаў у дзеючых цэнах. Ужо тады гэта былі лепшыя паказчыкі ў будаўнічай галіне рэспублікі. Давайце параўнаем тыя лічбы з вынікамі толькі што пражытага 2006 года. Як вы спрацавалі летась? Каб стала зразумелай дынаміка вашага развіцця.

— Адразу скажу, што леташнія паказчыкі нашай работы — нармальныя. Аб'ём работ, выкананы ўласнымі сіламі, склаў 177,7 мільярда рублёў і прырост да ўзроўню 2005 года на 114 працэнтаў. Патрэбна мець на ўвазе, што гэта амаль 10 працэнтаў ад аб'ёмаў будаўніча-мантажных работ Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва РБ і больш за 80 працэнтаў аб'ёмаў работ арганізацый міністэрства ў сталічнай вобласці. Да такога паказчыку ніхто больш не наблізіўся. У лепшым выпадку калегі выходзяць на адну трэць ад гэтых аб'ёмаў, што таксама, паверце, не лёгка і пачэсна.

З пачуццём гонару за свой калектыў магу адзначыць, што па генпадраду па выніках мінулага года мы перасягнулі паказчык у 200 мільярдаў рублёў. Калі канкрэтна, то выкананы аб'ёмы работ на 224 мільярды! Зноў жа для параўнання: у 2001 годзе генпадрад складаў у нас 32 мільярды рублёў. Такая вось дынаміка.

— У сельскай гаспадарцы рэспубліка бярэ прыклад з такіх перадавікоў, як нясвіжскі «Сноў». У вашай галіне, мусіць, калегам варта раўняцца на самую буйную будаўнічую арганізацыю краіны — «Салігорскпрамбуд»?

— Мы не робім сакрэтаў са сваёй вытворчай дзейнасці, з таго факта, што ў нас выпрацоўка вышэй на адну трэць, чым у іншых, і ахвотна дзелімся вопытам, калі ён некага цікавіць. Але зараз размова не аб гэтым, а аб жаданні і рэальнай магчымасці далейшага нарошчвання тэмпаў.

— І ўсё ж, чым бы вы асабіста патлумачылі прычыны сістэмнага росту аб'ёмаў, і такі сур'ёзны поспех — пакарэнне вяршыні ў 224 мільярды рублёў?

— Мэтанакіраванай дзейнасцю — дырэкцыі, нашых філіялаў, усяго калектыву, скіраванай на развіццё. Пачынаецца гэтая работа з планавання аб'ёмаў, планавання канкрэтных задач і прадаўжаецца да поўнай іх рэалізацыі. Бо калі мы спынімся з прыростам аб'ёмаў работ, то нельга будзе выканаць эканамічныя паказчыкі. Плюс пастаянны кантроль за самімі эканамічнымі паказчыкамі, за параметрамі тэхнічнага развіцця — з мэтай разумнага кіравання імі. Плюс укараненне ўсіх даступных нам мерапрыемстваў, якія садзейнічаюць высокапрадукцыйнай рабоце. «Звязда» даволі падрабязна расказвала, што мы аднавілі ў сябе на аб'ектах працоўнае саперніцтва, зараз яно разгорнута ў гонар 50-годдзя калектыву. Вынікі падводзяцца кожны месяц, а ўмовы — даволі жорсткія. Калі, напрыклад, у брыгадзе выяўлены выпадкі выканання работ з парушэннямі патрабаванняў СНіПа альбо парушэнні працоўнай дысцыпліны ці правілаў тэхнікі бяспекі, аховы працы, стануць вядомымі факты нездавальняючай культуры вытворчасці, неналежнай арганізацыі працы, нават нездавальняючай культуры паводзінаў у быце — набраныя за месяц балы здымаюцца як брыгадзе, так і майстру ці прарабу.

— Наколькі спаборніцтва — дзейсны рычаг сёння?

— Ведаеце, па-ранейшаму дзейнічае эфектыўна, бо за баламі стаяць «жывыя» грошы. Мы ўдасканальваем арганізацыю працоўнага саперніцтва. Зараз яго ўдзельнікамі сталі не толькі агульнабудаўнічыя, але і ўсе вытворчыя і падсобныя нашы падраздзяленні. Увялі прамежкавае падвядзенне вынікаў. Узнагароджваем не толькі лепшых брыгадзіраў, а цалкам брыгаду-пераможцу.

Мы не супакоіліся на ўкараненні (што, дарэчы, зрабілі першымі ў міністэрстве) сістэмы менеджменту якасці на аснове міжнародных стандартаў ISO 9002-96 з наступнай сертыфікацыяй яе мадыфікацый. Ідзе далейшая «шліфоўка» гэтай сістэмы, на кожны год складаецца свая праграма павышэння якасці будаўніча-мантажных работ.

Жыццёвай неабходнасцю стала асваенне новых тэхналогій і будаўнічых матэрыялаў, прымяненне высокапрадукцыйных механізмаў, перадавых прыёмаў працы. Вось на стале загад № 111 па ААТ, які падводзіць вынікі гэтай немалой работы ў мінулым годзе — ён на пяці шчыльных старонках камп'ютарнай раздрукоўкі. А асваенне новых тэхналогій і відаў работ адчувальна стымулюецца ўмовамі таго самага працоўнага спаборніцтва — балы, набраныя брыгадамі, майстрамі і прарабамі па выніках работы за месяц, павялічваюцца за наватарства ў 1,2 раза на перыяд укаранення і асваення, а гэта ўжо 3 месяцы.

Вядзём таксама кантроль за паказчыкамі колькасці працуючых. Наша колькасць на мінулы год склала 7,4 працэнта ад агульнай па міністэрству. (А даём, як вы памятаеце, амаль 10 працэнтаў усіх аб'ёмаў па міністэрству.) Справядліва кажуць, што ўсё забяспечваюць людзі. Без надзейных, падрыхтаваных кадраў нават пры добрай тэхнічнай узброенасці нічога не зробіш. Але «штыкоў» павінна быць роўна пад канкрэтныя аб'ёмы работ, не больш і не менш.

Важна, безумоўна, і як арганізавана іх работа. Мы па-ранейшаму штодня правяраем якасць выканання аперацый на рабочых месцах, і робім гэта не фармальна. Кожны ведае, што напрыканцы змены прыдуць прараб з майстрам ці брыгадзірам і прымуць работу, а халтуру — нізавошта не прымуць.

Ну і, канешне, дапамагае тое, што ў нас пастаянна ёсць заказы. Калі раней было складана з заказамі, то сёння гэтай праблемы, па крайняй меры, для нас, не існуе. Сур'ёзныя задачы ставіць перад «Салігорскпрамбудам» кіраўніцтва вобласці, і мы засяроджваем свае намаганні перш за ўсё на заказах вобласці. І вельмі селектыўна ставімся да прапаноў з іншых месцаў, нават па Мінску, а іх паступае многа. Мусім дзякаваць і — адмаўляемся. Бо з'явілася такая актуальная задача, як актыўнае будаўніцтва ў вёсцы. А што такое, нават з нашымі магчымасцямі, было ўзвесці 235 сядзібаў за мінулы год? Гэта не толькі дамы, але і хлявы, склепы — сапраўдная сялянская маёнтарка. У тым ліку 10 катэджаў у Александрыі, што ў Шклоўскім раёне — на радзіме Прэзідэнта, па яго даручэнню. Для прыкладу можна спаслацца і на Цімкавічы Капыльскага раёна, дзе мы ўзводзілі 41 дом. Дакладней, 41 гаспадарку. Сфарміраваўся пасёлак, які можна лічыць нават эталонам сучаснай вясковай забудовы для гэтага рэгіёна: з добраўпарадкаваннем вуліц, пешаходных зон і зон адпачынку. Мы хочам там узвесці яшчэ прыкладна 15 дамоў, каб прыкрыць танныя, а таму не вельмі прэзентабельныя, збудаванні мінулых гадоў і такім чынам завяршыць гэты комплекс.

Аналагічным чынам — грунтоўна, з душою — узведзены 25 дамоў у Танежыцах Слуцкага раёна. Таксама прыгожы атрымаўся пасёлак. Адзінае, там чамусьці не запланавана пракладка асфальтаванай дарогі і тратуараў з цвёрдым пакрыццём. Але думаю, вобласць прыме патрэбнае рашэнне па гэтаму пытанню, каб у выніку пасёлак сапраўды стаў дабротным і зручным для пражывання.



Летась мы пакінулі значны след у пяці блізляжачых раёнах вобласці, пасёлкі нашы бачныя з магістральных трас, яны цешаць вока і ўпрыгожваюць беларускую зямлю.

Трэба сказаць, што «Салігорскпрамбуд» наогул актыўна працуе на аграпрамысловы сектар. Выконваючы ўказ Прэзідэнта аб мерах па стварэнні ўмоў для развіцця ў рэспубліцы цяплічнай гаспадаркі, фактычна за год, са скарачэннем нарматыўных тэрмінаў у два разы, пабудавалі цяплічны камбінат з цяпліцамі плошчай 7 гектараў у вёсцы Багатырова Мінскага раёна. Далося нам гэта не проста. Своечасова дакументацыі не было, таму не змаглі зрабіць задзел, і працавалі зімой, у мінулагоднія лютыя маразы. Пачыналі нават з бура-ўзрыўных работ, каб мець магчымасць працаваць з грунтам, выканаць фундаменты і інфраструктуру. Пабудавалі кацельню, склады мінеральных угнаенняў і гатовай прадукцыі, інжынерныя сеткі, ачышчальныя збудаванні, воданапорную вежу і гэтак далей. Прычым у асноўным усё выканалі самі, без прыцягнення субпадрадчыкаў. Мы проста так работу не аддаём. Вучым, перавучваем людзей, калі патрэбна, і спраўляемся сваімі сіламі. У выніку ўсіх старанняў зараз ужо высаджана расада, і вясной новая цяпліца пачне карміць жыхароў сталіцы.

У 2006 годзе актыўна працавалі і на аб'ектах Міністэрства аховы здароўя. У сталіцы забяспечылі ўвод адзінага ў рэспубліцы навукова-даследчага інстытута траўматалогіі і артапедыі — НДІТА, у якім лечацца сотні людзей. Інстытут фактычна атрымаў другое нараджэнне. Спачатку разглядаўся «аблегчаны» праект, згодна з якім павінны былі выконваць выбарачны рамонт, на сёмым і восьмым паверхах. Але з улікам таго, што мяняліся ўсе камунікацыі — па гарызанталі і па вертыкалі, знізу да верху, мусілі ў рэшце рэшт усё ўзарваць, старое выкінуць і абсалютна ўсё зрабіць нанава. Такое рашэнне прымалася нялёгка, давялося доўга пераконваць, што сама тэхналогія патрабуе карэннай, а не касметычнай, рэканструкцыі. І ў выніку нарадзіўся фактычна новы аб'ект, ад страхі і да падвала. З новымі лячэбнымі плошчамі, аперацыйнымі і рэанімацыйнымі аддзяленнямі. Ад старога засталіся толькі нясучыя сцены, і тыя ўмацаваны і ўцеплены. Усе тры чаргі за паўтара года завершаны, важны сацыяльны аб'ект здадзены цалкам.

У Мінскай абласной бальніцы ў Бараўлянах правялі рэканструкцыю аперацыйнага (8 аперацыйных пакояў) і рэанімацыйных блокаў. Як і ў НДІТА, там зманціравана навейшае медыцынскае абсталяванне. У пасёлку гарадскога тыпу Старобін завершана будаўніцтва паліклінікі, а ў першым квартале гэтага года будзе ўведзены бальнічны корпус на 60 ложкаў.

Завяршылі сумесную праграму яшчэ з адным сваім салідным заказчыкам — РУП «Белаэранавігацыя». Яму пабудавалі дзве чаргі адміністрацыйна-вытворчага корпуса, з якога ажыццяўляецца кіраванне паветраным рухам, а таксама цудоўны лагер адпачынку дзяцей у прыгарадзе сталіцы. Без усялякага перабольшвання скажу, што сёння гэта — лепшы дзіцячы лагер на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь. З сучасным медыцынскім абсталяваннем, са зручнасцямі, з добраўпарадкаванай тэрыторыяй. Заказчык зараз думае, як яго эксплуатаваць круглы год і аздараўліваць нават дарослых, а гэта па ўмовах цалкам магчыма. Усё аўтаномна — сваё лячэнне ў асобным лячэбным корпусе, магчымасць наладзіць паўнацэннае харчаванне, адміністрацыйны корпус, свая кацельня, сетка водаправода.

2. Нашых планаў грамаддзё...

— Так што я ўсё ж меў рацыю, калі ў тэлефоннай размове сказаў, што з дапамогай вашага калектыву прыгажэюць сталіца і яе прыгарад... А якія сур'ёзныя аб'екты чакаюць сёлета, Мікалай Захаравіч?

— Перавага зноў будзе аддадзена ўзвядзенню жылля ў вёсцы, у тым ліку забудове аграгарадкоў. У вытворчай праграме — 209 увадных дамоў з адначасовым добраўпарадкаваннем тэрыторый, што прылягаюць. Гэтай задачы прыдаецца першаступеннае значэнне. Ад нас традыцыйна чакаюць не проста пабудоў, а самых лепшых дамоў у вёсцы. Таму і надалей будзем удасканальваць уласныя праекты і гатовыя аб'екты ў вёсцы, узяўшы за ўзор дамы ў Александрыі, дзе мы асабліва пастараліся, і ствараць для аграрыяў сучасныя ўмовы пражывання — яны таго заслугоўваюць. Адзін час будаўнікоў заганялі ў вузкія рамкі надуманых цэн на вясковы домік, у выніку гэтыя ўчарашнія «новабудоўлі» зараз даводзіцца хаваць за фасадамі нармальных дамоў, каб не псавалі агульную карціну. Што яшчэ раз сведчыць: жыццё нельга заганяць у штучныя рамкі. З капітальным будаўніцтвам не жартуюць. Можна поле засеяць адзін год адной культурай, не спадабалася — на наступны год іншай. А будаўнікі «засяваюць» сваё «поле» на сто гадоў, і эксперыменты тут неапраўданыя.

Патрэбна, ашчадна выкарыстоўваючы выдзеленыя сродкі, будаваць так, каб не было потым соромна за сваю работу. І пры гэтым чуйна прыслухоўвацца да спажыўца. Мы ўвялі ў практыку спецыяльныя апытальныя лісты, якія рассылаем сваім заказчыкам. У нашым аддзеле кантролю якасці і тэхналогіі будаўніцтва ў спецыяльнай папцы захоўваюцца сведчанні такой цеснай зваротнай сувязі. Тут шмат удзячных пісьмаў: ад дырэкцыі мемарыяльнага комплексу «Хатынь» за рэканструкцыю, ад начальніка УКСа Любанскага райвыканкама — за жыллё для вяскоўцаў, ад слуцакоў — за «Дажынкі», ад генеральнага дырэктара «Белтрансгаза» за Нясвіжскую газакампрэсарную станцыю, з «Беларуськалія» — за склад канцэнтратаў і гэтак далей. Але атрымліваем не толькі прыемныя водгукі аб выкананай намі рабоце, але і прапановы, а бывае, што і заўвагі, пажаданні. З таго ж калійнага гіганта. І мы заўсёды прыслухоўваемся, улічваем думку эксплуатацыйнікаў, звычайных спажыўцоў.

Напрыклад, практыка нас пераконвае, што пры будаўніцтве сядзібных домікаў у вёсцы зараз лепш адмовіцца ад склепа, замест яго рабіць нармальны падвал пад домам, дзе гаспадар будзе трымаць свае запасы. Таксама лічыцца ўжо, што не варта псаваць фасад домика гаражом, прыбудаваным збоку ці схаваным пад домам, але яго ўсё ж выдаюць масіўныя металічныя вароты. Калі гараж навасёлу патрэбен, то за домам ёсць так званы гаспадарчы праезд, і раённая архітэктура дасць яму дазвол на такую дабудову менавіта там.

Дык вось, сёлета — 209 увадных вясковых дамоў. Акрамя гэтага, шматпавярховыя дамы ў Салігорску і Слуцку. Таму амаль адну чацвёртую вытворчай праграмы складае ўзвядзенне жылля.

А ў Мінскім раёне ў вёсцы Ураджайнае будуем конна-спартыўны комплекс рэспубліканскага значэння: іпадром, канюшні, трыбуны для гледачоў і ўсё астатняе. Ёсць адпаведнае даручэнне Прэзідэнта, і гэта знакавы аб'ект для Мінскай вобласці. Тым больш, што губернатар сталічнай вобласці Мікалай Фёдаравіч Дамашкевіч — старшыня федэрацыі коннага спорту.

Варта асобна сказаць пра адзін з нашых самых галоўных клопатаў. Мы прымаем актыўны ўдзел у будаўніцтве пятага і шостага руднікоў у Салігорску. У сувязі з актывізацыяй будаўніцтва Чырвонаслабодскага і разгортваннем будаўніцтва Бярозаўскага руднікоў аб'ёмы работ па вытворчаму аб'яднанню «Беларуськалій» павялічваюцца на 225 працэнтаў. На пятым рудніку сёння працуем на складзе руды і шэрагу іншых аб'ектаў, рыхтуемся пачынаць работы на галаўной вентыляцыйнай. Хутка пачнём асвойваць пляцоўку шостага, Бярозаўскага рудніка — будзем будаваць рэзервуары, цягнуць інжынерныя сеткі.

Мы вядзём рэканструкцыю і дзеючай, асноўнай вытворчасці «Беларуськалія», курыруем яго прыродаахоўныя аб'екты.

У Любанскім раёне пачынаем узводзіць школу мастацтваў, гэта сацыяльна значны для раёна аб'ект. У Лагойскім і Салігорскім «растуць» буйныя жывёлагадоўчыя фермы на тысячу галоў кожная. У гэтым годзе павінны завяршыць і рэканструкцыю нясвіжскага завода «Медпрэпараты». Ужо ў першым квартале ўвядзём першую чаргу Цэнтра камерцыйных сувязяў у сталіцы і да канца года павінны будзем завяршыць аб'ект цалкам.

Я не ўсё называю, але вы і так бачыце, што вытворчая праграма года надзвычай напружаная.

3. Пра тое, што стрымлівае

— Мы размаўлялі наконт вытворчай праграмы з вашымі спецыялістамі, і яны скардзяцца на штучныя перашкоды, якія адчувальна замінаюць у рабоце.

— Без перашкод, на жаль, не абыходзіцца. Напрыклад, у апошнія гады сапраўдным бічом для будаўнікоў стала несвоечасовая падрыхтоўка праектаў і каштарысаў. Ідзе каманда працаваць з «ліста», і вось ужо майстру неабходна спраўляцца за заказчыка і праектны інстытут, чакаючы каштарыс. Закладзеныя ў ім расходы могуць адрознівацца ад зробленага, а розніца — пайсці «чырвоным», як прыпіскі. У лепшым выпадку будуць зняты аб'ёмы работ. А не, дык той жа майстар можа і ў турме апынуцца. І да будаўнічай арганізацыі прымяняюцца такія эканамічныя санкцыі, што неба ў аўчынку здаецца. А за што, за чужыя грахі?

Летась не па сваёй віне мы правалілі, што называецца, важны аб'ект — Цэнтр камерцыйных сувязяў у Мінску. Таксама мусілі будаваць без своечасовага забеспячэння дакументацыяй, якая перапрацоўвалася многа разоў і выдавалася «порцыямі» да самага канца 2006 года і нават у студзені 2007-га. Несвоечасовая выдача і бясконца ўносімыя ў яе змяненні прыводзілі да неаднаразовых перароабак. Вось і атрымалася, што 16 мільярдаў уласнымі сіламі выканалі, забяспечылі 14 працэнтаў прыросту аб'ёмаў, а ў тэрмін не ўклаліся. Хоць адзіны такі збой, а непрыемна. І ўдвая непрыемна, што не наша «заслуга».

Праектна-каштарысная дакументацыя павінна выдавацца будаўнікам загадзя, а не «задним числом» і не «параллельно», гэтая «параллельность» разарыла ў Мінску не адну фірму. Атрымліваецца, што з будаўнікоў за чужыя грахі спагнаць можна, а з заказчыка, які не падрыхтаваўся як след, нельга.

Апошнім часам пайшла такая «мода», што заказчык лічыць не абавязковым своечасова плаціць будаўнікам за этапы выкананых работ, а то і за аб'ект у цэлым. Калі гэта чыноўняя арганізацыя, адзіным багаццем прадстаўнікоў УКСаў якой з'яўляюцца «манішка ды запісная кніжка», то з яе і праз суд нельга нічога атрымаць. Ніякай маёмаснай адказнасці яна не нясе. І тут мы ставім пытанне аб неабходнасці гарантый з боку ўладаў альбо фундатараў, якія гарантуюць разлік з будаўнікамі за кошт гарадскога, раённага, абласнога бюджэту ці фундатара. А то за другую чаргу гандлёвага цэнтра на вуліцы Аэрадромнай у Мінску трэці год вісіць запазычанасць разам з пеняй каля 5 мільярдаў рублёў.

— Як бачна, праблем у будаўнікоў шмат...

— Тым не менш усе яны — вырашальныя, і іх своечасовае вырашэнне дапаможа нам працаваць яшчэ больш прадукцыйна.

Скажам, зараз наша Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва ўшчыльную ўзялося за работу ўласнай прамысловасці будаўнічых матэрыялаў. Праўда, усе разумеюць, што гэта праблема комплексная, бо забяспечваюць будаўнічую галіну не толькі яе ўласныя прамысловыя прадпрыемствы. Канешне, многае можа зрабіць Беларускі металургічны завод у Жлобіне, каб, у прыватнасці, будаўнікі не адчувалі вострага дэфіцыту металу («шасцёркі», «васьмёркі»), які ідзе на жыллёвае будаўніцтва. Але многае могуць зрабіць і прадпрыемствы металаапрацоўчай галіны (тыя ж камплекты танных дзюбеляў), дрэваапрацоўкі (нагогул вялікі асартымент), нават лёгкай прамысловасці (дывановыя пакрыцці). Патрэбна наладзіць выпуск бетонаддзелачных машын, вібратараў, малагабарытных самаходных цялежак-маніпулятараў для работы на перакрыццях. Востра патрэбны паўпрычэпы для перавозкі цяжкай будаўнічай тэхнікі і бытовак і шмат чаго іншага.

І ўсё гэта патрэбна якаснае. Фактычна на ўсю сваю прадукцыю беларускія прадпрыемствы-вытворцы даюць гарантыю... ад трох да шасці месяцаў. А мы пасля здачы аб'екта гарантуем заказчыку яго бездакорнае функцыянаванне на працягу двух гадоў. Вось і атрымліваецца, што той жа дзвярны замок мы паспяваем памяняць за гарантыйны тэрмін тры разы і тры разы заплаціць за яго. Вокны маюць год гарантыі. А будаўнікі адказваюць за іх два такія тэрміны. Мы, сертыфікаваная арганізацыя, не можам зніжаць гарантыйны тэрмін. Значыць, да нашага ўзроўню павінны падцягвацца айчынныя вытворцы. Не сакрэт, што так званая «еўраякасць» забяспечана альбо імпартнымі матэрыяламі, альбо матэрыяламі СП.

На адным з пасяджэнняў калегіі міністэрства для рашэння шэрагу стратэгічных праблем былі створаны рабочыя групы — у будаўніцтве пад кіраўніцтвам вашага пакорнага слугі, у прамысловасці — генеральнага дырэктара ААТ «Краснасельскбудматэрыялы» Валянціна Алегавіча Верацілы. Мы ўнеслі прапановы па далейшаму павышэнню якасці будаўніцтва; па ўдасканаленню архітэктурных і канструктыўных рашэнняў вясковых сядзібных домікаў; прапанавалі вярнуцца да большай спецыялізацыі праектных інстытутаў, што дазволіць мець падрыхтаваныя кадры і пазбегнуць памылак пры праектаванні; актывізаваць работу спецыялізаваных праектна-тэхналагічных арганізацый міністэрства, якія б забяспечылі распрацоўку тэхналагічных карт на ўвесь комплекс будаўніча-мантажных работ, у тым ліку з прымяненнем новых матэрыялаў і тэхналогій. Унеслі таксама і прапановы па арганізацыі выпуску новых матэрыялаў, канструкцый і механізмаў на прадпрыемствах прамысловасці Беларусі. Прычым звярнулі ўвагу на неабходнасць правесці на заводах, вытворцах такой прадукцыі, мэтанакіраваную работу для давядзення тэрмінаў гарантыі на яе да двух гадоў. Будаўнікі разлічваюць на дапамогу галіновых міністэрстваў, урада рэспублікі ў вырашэнні гэтых вельмі надзённых задач. А мы адкажам уводам новых прыгожых, сучасных аб'ектаў у гарадах і вёсках сінявокай Беларусі.

АД РЭДАКЦЫІ. Мы мяркуем у самы бліжэйшы час прадоўжыць размову аб праблемах, узнятых заслужаным будаўніком рэспублікі, кавалерам двух ордэнаў Працоўнага Чырвонага Сцяга Мікалаем Захаравічам АШЭЙЧЫКАМ на старонках «Звязды». Запрашаем будаўнікоў, прадстаўнікоў заказчыкаў, проста зацікаўленых людзей прыняць удзел у абмеркаванні.

Публікацыю падрыхтаваў Уладзімір ХІЛЬКЕВІЧ.

НА ЗДЫМКАХ:

1. Генеральны дырэктар ААТ «Салігорскпрамбуд» Мікалай Захаравіч АШЭЙЧЫК.

2. Адноўлены будынак навукова-даследчага інстытута траўматалогіі і артапедыі ў Мінску.

3. Вытворчыя магутнасці гіганта нафтахіміі — вытворчага аб'яднання «Беларуськалій» ствараліся рукамі калектыву «Салігорскпрамбуда».

4. Новае аблічча беларускай вёскі. Домікі ў Цімкавічах Капыльскага раёна. Тут іх, такіх яркіх, прыгожых, больш за сорак.

5. Адміністрацыйна-вытворчы корпус «Белаэранавігацыі» ў сталіцы быў узведзены ў дзве чаргі. Зараз адсюль кіруюць паветраным рухам на тэрыторыі рэспублікі.

6. Газ у Еўропу — праз Беларусь. Сучасную кампрэсарную станцыю ў Крупках пабудавалі салігорскія майстры на ўсе рукі.

7. Гэта толькі адзін з фрагментаў панарамы лепшага ў Беларусі дзіцячага аздараўленчага лагера-прафілакторыя «Ракета» ў Ждановічах.

Здымкі прадастаўлены ААТ «Салігорскпрамбуд».

НА ЗАМЕТКУ ПАРТНЕРАМ

ОАО «Солигорскпромстрой»
223710 Республика Беларусь,
Минская область, г. Солигорск,
ул. Козлова, 37.
Тел. (01710) 24140, факс (01710) 29946.
E-mail: oao__sps@mail.ru